Асцярожна! Грыбны сезон у Беларусі яшчэ не паспеў стартаваць, аднак колькасць ахвяр атручэння грыбамі дасягнула ўжо 13 чалавек. Дзевяць пацярпелых з'яўляюцца жыхарамі сталіцы, і трое — жыхарамі Брэстчыны. СТАР 4

Пра гасціннасць сённяшніх гаспадароў унікальнай сядзібы — помніка драўлянага дойлідства — Панасенкаў людзі ведаюць не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. СТАР 6

Алена Ланская заняла 16-е месца на «Еўрабачанні». Але пройгрышам гэты вынік не лічыць і адзначае: «Я шчаслівая, бо збылася мара дзяцінства — выступіць на «Еўрабачанні». СТАР 8

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

21 МАЯ 2013 г. АЎТОРАК № 90 (27455) Кошт 1500 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

■ Афіцыйна

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА АДЗНАЧАЕ ВАЖНАСЦЬ АДНОСІН З ІНДЫЯЙ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўчора на сустрэчы са спікерам Народнай (ніжняй) палаты Парламента Індыі Мейрай Кумар адзначыў важнасць адносін з Індыяй, перадае БЕЛТА.

«Індыя — гіганцкая, найбагацейшая, вядучая краіна свету, і нам вельмі важны адносіны з Індыяй», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што двухбаковыя адносіны маюць даўнюю гісторыю, а за апошнія гады значна інтэнсіфікаваліся.

Гаворачы аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве дзвюх краін, Прэзідэнт адзначыў, што існуючы тавараабарот у памеры паўмільярда долараў — гэта зусім няшмат. «Лічу, нам трэба ставіць яшчэ большыя мэты і пераходзіць ад простага тавараабмену да каапераційных сувязей, стварацьсумесныя прадпрыемствы тут і там, у Індыі, паглыбляць нашы гандлёва-эканамічныя адносіны», — сказаў беларускі лідар.

Што датычыцца палітыкі і дыпламатыі, то Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што тут праблем у дзвюх краін няма. Кіраўнік беларускай дзяржавы падзякаваў індыйскаму боку за пазіцыю, якую ён займае ў міжнародных арганізацыях. «Мы гэта вельмі цэнім, — сказаў Прэзідэнт. — Мы заўсёды будзем падтрымліваць Індыю, таму што яшчэ не было такога выпадку, каб Індыя адмовіла ў падтрымцы Беларусі».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў Беларусі і Індыі ёсць добрая аснова супрацоўніцтва, а візіт спікера індыйскага парламента ў Беларусь — сведчанне таго, што краіны поўныя рашучасці развіваць двухбаковыя адносіны.

Мейра Кумар у сваю чаргу перадала кіраўніку беларускай дзяржавы найлепшыя пажаданні ад Прэзідэнта, прэм'ер-міністра і народа Індыі. «Беларусь і Індыя традыцыйна падтрымлівалі цёплыя і сардэчныя, дружалюбныя адносіны», — сказала яна, дадаўшы, што за апошнія гады краінам удалося палепшыць двухбаковае гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва.

БКК МАЕ НАМЕР УЗМАЦНІЦЬ УПЛЫЎ НА СУСВЕТНЫМ РЫНКУ КАЛІЙНЫХ УГНАЕННЯЎ

Пытанні сумесных дзеянняў на рынку калійных угнаенняў і перспектывы супрацоўніцтва абмяркоўваліся ўчора на сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з членам Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі — акцыянерам ААТ «Уралкалій» Сулейманам Керымавым, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка беларускай дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што ў цяперашніх умовах бакі павінны ўзмацніць сваё адзінства ў сферы рэалізацыі калійных угнаенняў.

«Любая спроба дзейнічаць паасобку, асабліва цяпер, мы ж стварылі адзіную кампанію па рэалізацыі калійных угнаенняў, будзе толькі шкодзіць і «Уралкалію» з аднаго боку, і «Беларускалію» з другога, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — І мы не скрываем, што будзем узмацняць нашы дзеянні па адзінстве на рынку калійных угнаенняў».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэта пазіцыя беларускай дзяржавы, якой прытрымліваюцца ўсе: пачынаючы ад кіраўніка кампаніі, якая вырабляе калійныя ўгнаенні, і да Прэзідэнта.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што гатовы выслухаць любыя прапановы расійскага боку ў рамках такой канцэпцыі.

МАЙСКАЯ НОЧ БЕЛАРУСКАГА «ЛУЎРА»

У падтрымку міжнароднай культурніцкай акцыі «Ноч музеяў-2013» у ноч з 18 на 19 мая былі расчынены выставачныя залы сталічнага Нацыянальнага мастацкага музея. Лепшая экспазіцыйная пляцоўка краіны не заставала: тысячы мінчан і гасцей горада выкарысталі цудоўную магчымасць і паспяшаліся далучыцца да свету нацыянальнага і сусветнага мастацтваў. Каля ўваходу ў беларускі «луўр» ужо з вечара ўтварылася вялікая чарга. Разам з апантанымі аматарамі прыгожага сярод палотнаў і скульптур, старажытных абразоў і сучасных фотаздымкаў блукаў і наш фотакарэспандэнт Анатоль КЛЯШЧУК.



ЦЫТАТА ДНЯ

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Андрэй КАБЯКОЎ:

«Праграма развіцця транспартна-лагістычнай сістэмы на 2010-2015 гады рэалізуецца дастаткова нармальна. Хацелася б большага, але, з іншага боку, нельга будаваць цэнтры, калі няма адпаведных таварапатокаў. Гэта павінна ісці паралельна нарошчванню транзіту. Асновай для такога росту можна лічыць ужо пачатую рэальную працу па Мытным кодэксе МС. Транзіт — гэта натуральная геаграфічная і стратэгічная перавага Беларусі ў Мытным саюзе. Але каб яе рэалізаваць, трэба працаваць, прапаноўваць больш шырокі сэрвіс, больш канкурэнтныя цэны».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.05.2013 г.

Долар ЗША	8650,00	▼
Еўра	11120,00	▼
Рас. руб.	276,00	■
Укр. грыўня	1060,31	▼

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 22°
Віцебск	+ 21°
Гомель	+ 26°
Гродна	+ 23°
Магілёў	+ 22°
Мінск	+ 23°

■ Жыллёвая арыфметыка

СТАЛІЧНЫ «КВАДРАТ» НАБІРАЕ ВАГУ

Эксперты прагназуюць, што ўжо праз год кошт квадратнага метра жылля ў Мінску павялічыцца да 2 тысяч USD

Адразу адзначу той факт, што актывізацыя на другасным рынку жыллёвай нерухомасці ў нашай краіне пачалася не ўчора, а стартавала яшчэ ў снежні, аднак... Тады рынак заварушыўся неяк нясмела. Спецыялісты лічылі гэта нейкім сезонным усплёскам. Пра тэндэнцыі на другасным рынку жыллёвай нерухомасці сталіцы карэспандэнту «Звязды» расказвае наш эксперт — старшыня рады Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць», дырэктар агенцтва нерухомасці «БелЦТН» Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ.

Расце актыўнасць пакупнікоў

Звычайна патэнцыяльныя кліенты агенцтваў нерухомасці ў трэцяй дэкадзе мая ўжо не так актыўна цікавяцца новымі прапановамі на рынку, бо трэба рыхтавацца да лета. Так было раней. Цяпер будучыя пакупнікі жылля «жывуць» на другасным рынку нерухомасці ўвесь год, бо некаторыя чуткі палохаюць увядзеннем жорсткіх захадаў для камерцыйных забудоўшчыкаў. Таму пакупнікоў стала больш, але нейкага сур'ёзнага ажыятажу на рынку няма, бо павялічваецца часам і колькасць прапаноў з боку прадаўцоў. Зараз на рынку сталіцы ў адначасовым продажы знаходзіцца каля 5600 кватэр. Так, кватэр хапае, бо ўласнікі «лішняга» жылля даволі хутка рэагуюць на павялічаны попыт і ўздымаюць кошты. Толькі за тры апошнія месяцы сярэдні кошт прапановы адна- і двухпакаёвых кватэр павялічыўся на 5—7 працэнтаў.

Далей тэндэнцыі на рынку жыллёвай нерухомасці працягваюць развівацца пад уздзеяннем ужо эмацыянальных фактараў пакупнікоў. Кліенты пачынаюць нерваваца і спяшаюцца набыць жыллё, пакуль яно яшчэ больш не падаражэла.

СТАР 4

Міхаіл ФІНБЕРГ:

«Мы адкрылі такіх беларускіх кампазітараў, якіх нават я не ведаў!»

або Як Моцарт звязаны з Беларуссю?

У 18-ы раз прайшло свята мастацтваў «Музы Нясвіжа», нязменным мастацкім кіраўніком якога з'яўляецца народны артыст Беларусі, прафесар Міхаіл Фінберг. У трохдзённую праграму фестывалю (16 — 18 мая) увайшла беларуская і еўрапейская класічная і папулярная музыка розных часоў у выкананні і апрацоўцы цудоўных беларускіх музыкантаў. Такім чынам фестываль прасоўвае не толькі высокую музычную культуру, але і высакакласнае выканальніцкае майстэрства. Напрыклад, у ансамблі флейтыстаў Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам Уладзіміра Скарабагатава ўсе салісты маюць так званыя сярэбраныя флейты. І на розных канцэртах флейтыстка Юлія Шчасневіч па просьбе вядучых часта дэманструе сваю сярэбраную флейту, якую атрымала ад самога маэстра Уладзіміра Співакова. СТАР 3

Фота БЕЛТА.

■ Увага: «прамая лінія»!

НАШ КУЛЬТУРНЫ СВЕТ

З чаго ён складаецца, як захоўваецца і ўзбагачаецца? На ўсе пытанні, якія тычацца існавання і развіцця культуры ў Рэспубліцы Беларусь, можна атрымаць адказ з вуснаў **міністра культуры Барыса Уладзіміравіча СВЯТЛОВА**. «Прамая лінія» пройдзе ў рэдакцыі газеты «Звязда» **23 мая ў 11 гадзін**. Тэлефоны, па якіх можна звяртацца з пытаннямі ў гэты дзень: 287-18-66, 287-18-71.

Папярэдне пытанні прымаюцца па тэлефоне ў Мінску 287-18-69, таксама іх можна дасылаць поштай ці на электронны адрас: info@zviazda.minsk.by (з паметкай «для аддзела культуры»). Адказы на найбольш цікавыя і актуальныя пытанні будуць надрукаваны ў газеце.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

МВФ ПАТРАБУЕ ПАВЫСІЦЬ ТАРЫФЫ НА ГАЗ ДЛЯ ЎКРАІНЦАЎ

Адной з ключавых умоў для атрымання Украінай фінансавай дапамогі Міжнароднага валютнага фонду з'яўляецца павышэнне тарыфаў на газ для насельніцтва на 40%, перадаюць інфармагенцтвы са спасылкай на штотыднёвік «Люстэрка тыдня. Украіна». Гэтыя ўмовы змяшчаюцца ў праекце мемарандума аб эканамічнай і фінансавай палітыцы паміж Украінай і МВФ, тэкст якога маецца ў распараджэнні ZN.UA. Павышэнне тарыфаў — гэта адзін з ключавых элементаў аздараўлення дзяржаўных фінансаў, стан якіх эксперты МВФ ацэньваюць з улікам і фінансавага стану НАК «Нафтагаз Украіны», паведамляе выданне. Распрацоўка графіка павышэння тарыфаў, як і зацвярджэнне праграмы павышэння эфектыўнасці выкарыстання энергарэсурсаў з мэтай павышэння эфектыўнасці жыллёвага, камунальнага і дзяржаўнага сектараў, для ліквідацыі страт «Нафтагаза» прадугледжваецца як папярэдняя ўмова падпісання пагаднення. У дакуменце ўказана, што ў выніку гэтых і шэрагу іншых захадаў, а таксама нарошчвання ўнутранай газаздабычы дэфіцыт «Нафтагаза» павінен скарацицца да 0,5% ВУП ужо ў 2014 годзе. Зрэшты, для маламаёмных слаёў насельніцтва ёсць і добрая навіна: адна з умоў праграмы — удасканаленне адраснасці праграм сацыяльнай дапамогі ў адпаведнасці з рэкамендацыямі МВФ. Пры гэтым для частковай кампенсацыі павышэння тарыфаў прадугледжваецца выдзяленне субсідый для самых бедных хатніх гаспадарак. А вось прамыя субсідыі з бюджэту для камунэнерга павінны быць ліквідаваны.

КАБ ПАЛЕПШЫЦЬ ФІГУРУ, ДАСТАТКОВА 7 ХВІЛІН У ДЗЕНЬ?

Амерыканскі каледж Спартыўнай медыцыны высветліў: каб падтрымліваць фігуру, дастаткова 7-хвілінных комплексаў з 12 практыкаванняў. Адзінае патрабаванне — практыкаванні павінны быць інтэнсіўнымі (на кожнае практыкаванне — па 30-60 секундаў). Спачатку ідуць скачкі (разаграваюць цела), потым — прысяданні каля сцяны з прыпёртай спіной (дае нагрузку на ніжнюю частку цела). Адціскланні, трэніроўка прэса са становішча лежачы, уздым на стэп або крэсла і зноў прысяданні, — вось першая частка комплексу.

Другая частка: зваротныя адціскланні ад крэсла — для трыцэпса, бег на месцы з высока паднятымі каленямі, выпады, адціскланні, бакавая планка. Усяго два тыдні ў такім рэжыме можна параўнаць з 6-8 тыднямі трэніровак на цягавітасць.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ЛІТВА АДЧУВАЕ НЕДАХОП КВАЛІФІКАВАНАЙ ПРАЦОЎНАЙ СІЛЫ

Літва адчувае востры недахоп кваліфікаванай працоўнай сілы, і можа здарыцца так, што яна павінна будзе спрабаваць прыцягваць кваліфікаваных работнікаў з-за мяжы. Пра гэта заявіў у інтэрв'ю «Жыню радзіяс» прэм'ер-міністр Літвы, лідар сацыял-дэмакратаў Альгірдас Буткявічус.

Кіраўнік Кабінета міністраў Літвы сказаў, што прадпрымальнікі адчуваюць недахоп кваліфікаваных кадраў, і гэта можа затармазіць рэалізацыю буйных праектаў. Літва з часам будзе вымушана прыцягваць спецыялістаў розных галін: ад кваліфікаваных рабочых, зваршчыкаў, токараў, манцёраў — да высокакваліфікаваных інжынераў і менеджараў.

Між тым, у Літве налічваецца больш за 200 тыс. беспрацоўных: на 1 сакавіка 2013 года, па звестках Біржы працы Літвы, іх было 229,9 тыс., або 12,4% працаздольнага насельніцтва краіны. Паводле апошняга перапісу насельніцтва, колькасць працаздольных жыхароў у краіне скарацілася на 164,4 тыс.

КАРОТКА

Следчы камітэт да пачатку функцыянавання афіцыйнага сайта інфармуе грамадзян Беларусі аб тым, што яны могуць накіроўваць свае электронныя звароты на адрас sk@sk.gov.by. Пры гэтым, як падкрэслілі ў СК, электронныя звароты павінны адпавядаць патрабаванням, якія прад'яўляе закон «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб» да пісьмовых зваротаў, а таксама змяшчаць адрас электроннай пошты заяўніка.

Продаж золата і серабра ў мерных злітках у красавіку рэзка вырас у параўнанні з сакавіком. У красавіку Нацбанк рэалізаваў залатыя зліткі вагой 56,6 кг супраць 27,54 кг у сакавіку. Сур'ёзнае павелічэнне продажу назіралася і па серабру. Агульная вага такіх злітка, прададзеных Нацбанкам, за красавік склала 79,38 кг, у сакавіку было прададзена 38 кг.

Колькасць беспрацоўных, зарэгістраваных у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Беларусі, на канец красавіка бягучага года склала 25,7 тыс. чалавек. Гэта на 15,8% менш, чым на канец красавіка 2012 года і на 1,6% больш, чым на канец сакавіка 2013-га.

ЯКІЯ ПЕСНІ ВАМ ДАСПАДОБЫ?

Святлана Ісаёнак, кіраўнік прэс-службы Студэнцкага саюза БДУ:

— Усе песні, якія мне зараз падабаюцца, сабраныя ў маім плэеры. Там вельмі розная музыка. Пачынаючы ад сучаснай танцавальнай і заканчваючы джазам 60-х. Я слухаю якую-небудзь новую мелодыю і адразу ў думках «ляплю» на яе ярлык «падабаецца» — «не падабаецца». А пасля, таксама ў думках, адпраўляю яе ў раздзел адпаведнага настрою — «Сум», «Радасць», «Задуменнасць», «Спорт». У плэеры яны ўсе менавіта так у мяне і сабраны. Яшчэ вельмі люблю прызлівую музыку, ад якой сэрца захоплівае і ноты як быццам пранікаюць у кроў. Напрыклад, як песня Moon River з кінафільма «Сняданак у Ціфані». У асноўным мая любімая музыка — замежная. Але зрэдку ў плэеры можна сустрэць, напрыклад, Земфіру, або папулярнага зараз беларуса Макса Каржа.

Вольга Бакевіч, педагог-арганізатар сярэдняй школы № 105 г. Мінска:

— Песня — гэта штосьці жывое. Яна, як кожны чалавек, нараджаецца, жыве, радуе, прыносіць задавальненне людзям, дзеля якіх існуе. Кожная песня мае сваё прызначэнне. Які век у яе, якое жыццё, колькі ёй адмерана пражыць, залежыць ад яе «бацькоў» — паэта і кампазітара. Мудрасцю, глыбокім сэнсам, прыгажосцю надзяляюць яны сваё дзіця. А вось якім яго ўбачыць свет — залежыць ад выканаўцаў. Калі спявак зразумее душу песні, то жыццё будзе доўгім і пражыць яна зможа не адно стагоддзе.

Мне даспадобы спевы з глыбокім сэнсам. Музыка «Песняроў», «Сяброў» па-сапраўднаму з'яўляецца візітнай карткай беларусаў. Многія творы ў іх выкананні мы лічым народнымі, хаця і напісаны яны на словы нашых паэтаў.



Арцём Ставер, курсант ваеннага факультэта БДУ:

— Прыхільнасцяў да пэўнага стылю музыкі ў мяне няма, усё слухаю па настроі. Пачынаючы ад рэпа і заканчваючы індзі-рокам. Любімы гурт гэта, мабыць, брытанскі Kasabian. Падабаюцца перапрацаваныя пад калыханкі спевы гурта Nirvana — напрыклад, песенька Lithium. Вядома, паважаю электронную музыку. Даўным-даўно я займаўся танцамі, і тады ў маім плэй-лісце з'явілася сучасная танцавальная музыка. Адсюль і такая разнапланавасць у музычных густах. Асноўны крытэрый, па якім я выбіраю сабе музыку, — дынаміка. У апошні час стаў падабаецца гурт Burial. Пра іх кажуць многае, але асноўная канцэпцыя іх музыкі — лёгкасць і ненадакучлівасць. Маўляў, яны гуляюць на «струнах настрою». Дарэчы, нешта такое ёсць...

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.

ВІЗІТ НА ВЫСОКІМ УЗРОЎНІ

Цяперашні візіт парламенцкай дэлегацыі Індыі ў Беларусь адыграе вялікую ролю ў развіцці міжпарламенцкага супрацоўніцтва дзвюх краін. Аб гэтым учора заявіў старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір Андрэйчанка на сустрэчы са спікерам Народнай палаты Парламента Рэспублікі Індыя Мейрай Кумар, перадае БЕЛТА.

«Гэта першы візіт ад Народнай палаты Індыі ў Беларусь на такім высокім узроўні. Упэўнены, што візіт адыграе вялікую ролю ў развіцці міжпарламенцкага супрацоўніцтва», — адзначыў Уладзімір Андрэйчанка.

Ён падкрэсліў, што Беларусь даражыць адносінамі, якія склаліся з Індыяй. Спікер нагадаў, што дыпламатычным адносінам дзвюх краін ужо 20 гадоў. За гэты час былі дасягненні ў палітычнай сферы, у тым ліку ў міжпарламенцкім супрацоўніцтве, галіне навукоўца, адукацыйнага супрацоўніцтва і па іншых напрамках.

Беларускі бок разглядае Індыю ў якасці аднаго з важнейшых гандлёвых партнёраў у Азіі. У мінулым годзе аб'ём гандлю паміж дзвюма краінамі склаў $494,4 млн. З Беларусі экспартавана прадукцыі на $262,2 млн.

У сваю чаргу Мейра Кумар падзякавала беларускаму боку за цёплы прыём: «І я, і члены маёй дэлегацыі вельмі рады прыехаць у гэту прыгожую краіну». Яна таксама адзначыла, што ёй спадабалася беларуская сталіца. На думку індыйскага спікера, беларускі народ працавіты.

Падчас сустрэчы Уладзімір Андрэйчанка і Мейра Кумар падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Народнай палатай Парламента Рэспублікі Індыя.

НОВЫ ІМПУЛЬС У АДНОСІНАХ

Беларусь разглядае В'етнам як надзейнага партнёра ў Азіяцка-Ціхаакіянскім рэгіёне

Пра гэта заявіў спікер верхняй палаты беларускага парламента Уладзімір Андрэйчанка на сустрэчы з кіраўніком урада Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам спадаром Нгуен Тан Зунгам.

— Ваш візіт мае вельмі вялікае значэнне для абедзвюх дзяржаў, — сказаў, прымаючы высокага госця ў Палаце прадстаўнікоў, Уладзімір Андрэйчанка. — Мінулы раз наша асабістая сустрэча адбылася ў кастрычніку 2010 года ў рамках афіцыйнага візіту парламенцкай дэлегацыі Рэспублікі Беларусь у Ханой. Гэта быў вельмі карысны і прадуктыўны візіт: мы пазнаёміліся з вашай краінай, яе гісторыяй, культурай, пабывалі на прамысловым прадпрыемстве, у адной з правінцый. І самы галоўны вынік — тыя дамоўленасці, якіх мы тады дасягнулі, альбо ўжо рэалізаваныя, альбо рэалізоўваюцца.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў заўважыў, што за 20-гадовы перыяд усталявання дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і В'етнамам шмат зроблена ў гандлёва-эканамічным, міжпарламенцкім, гуманітарным, навукова-тэхнічным супрацоўніцтве, на палітычнай арэне. Уладзімір Андрэйчанка выказаў таксама меркаванне, што ўрадавы візіт Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам у Беларусь, надасць новы імпульс у адносінах паміж краінамі.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

З НАМІ ГАТОВЫ ІСЦІ Ў РАЗВЕДКУ. ФІНАНСАВУЮ

Гэта стала зразумела на сумесным семінары Еўразійскай групы па супрацьдзеянні легалізацыі злачынных даходаў і фінансаванні тэрарызму (ЕАГ) і Групы «Эгмант» па абмене вопытам выкарыстання інфармацыйных тэхналогій для правядзення фінансавага аналізу з мэтай супрацьдзеяння фінансавым махінацыям, які адбыўся ўчора ў Мінску.

«Эгмант» — гарантыя бяспечнага абмену інфармацыяй

Семінар стаў першым мерапрыемствам ў межах Пленарнага тыдня ЕАГ, які закончыць сваю працу 24 мая. У Групу «Эгмант» Беларусь уваходзіць з 2007 года і з'яўляецца актыўным яе ўдзельнікам. Нездарма сумеснае мерапрыемства з ЕАГ па пытаннях развіцця інфармацыйных тэхналогій праходзіць менавіта ў нашай краіне. «Група «Эгмант» выступае з ідэяй рэгіяналізацыі барацьбы з «адмываннем» грошай, і мы ўсё болей пераконваемся ў эфектыўнасці такога падыходу. Гэтае мерапрыемства — першае сведчанне камбінавання рэгіянальнага супрацоўніцтва «Эгмант» і ЕАГ», — падкрэсліў Будэвін Верхельст, старшыня Групы «Эгмант», кіраўнік фінансавай разведкі Бельгіі. Ён вельмі рады магчымасці апынуцца ў Беларусі, бо такая сустрэча дзвюх арганізацый, на яго думку, вельмі важная. «Усходняя Еўропа ў межах сеткі абмену інфармацыяй Групы «Эгмант» — гэта рэгіён, які вельмі актыўна ўдзельнічае ў нашай працы». Фінансавы разведчык назваў Беларусь адным з самых актыўных членаў Групы, аднак ён упершыню сустрэўся асабіста з беларускімі калегамі.

Будэвін Верхельст лічыць, што канчатковай мэтай Групы «Эгмант» з'яўляецца пабудова сапраўды глабальнай сеткі фінансавых разведак. «Уявіце сабе, якую ролю адыгрывае для паліцыі Інтэрпал, і вы зразумееце, чым павінна быць «Эгмант» для падраздзяленняў фінансавай разведкі, — заявіў спецыяліст. — Абмен інфармацыяй з іншымі ПФР — вельмі важная частка працы любой фінансавай разведкі. ПФР, якое не можа размаўляць ні са сваімі суседзямі, ні з краінамі ў іншым канцы свету, працуе фактычна ўсляпую, бо «адмыванне» злачынных даходаў і фінансаванне тэрарызму — гэта злачынствы, трансмежныя па сваёй прыродзе. Першая важная перавага, якую атрымлівае член Групы, — гэта доступ да бяспечных каналаў сувязі. Унутры «Эгмант» вы можаце быць упэўненымі ў тым, што ваша інфармацыя не будзе раскрыта».

Змаганне са злачынствамі, нягледзячы на палітыку

Адным з асноўных пытанняў семінара стала абмеркаванне новых ініцыятыў міжурадавай Групы распрацоўкі фінансавых захадаў барацьбы з «адмываннем» грошай (ФАТФ). Пра гэта заявіла Хэні Фербеек-Кустэрс, кіраўнік фінансавай разведкі Каралеўства Нідэрландаў, кіраўнік працоўнай групы па ІТ Групы «Эгмант». Летась ФАТФ прыняў новую рэдакцыю «40 рэкамендацый» (рэкамендацый у сферы барацьбы з адмываннем грошай, прынятых у 1990 годзе). Спецыяліст з Нідэрландаў таксама звярнула ўвагу на характар Групы «Эгмант», для якой не мае значэння палітычны складнік адносін паміж краінамі-ўдзельніцамі: «Мы імкнёмся быць максімальна непалітычнай арганізацыяй. Мы прафесійная арганізацыя, якая забяспечвае супрацоўніцтва і абмен інфармацыяй паміж падраздзяленнямі фінансавай разведкі. І мы будзем працягваць сваю дзейнасць, незалежна ад палітычных адносін паміж рознымі краінамі. Барацьбу з «адмываннем» злачынных даходаў і фінансаваннем тэрарызму трэба весьці разам», — сказала Хэні Фербеек-Кустэрс.

Беларуская фінансавая разведка

Яе функцыі выконвае Дэпартамент фінансавага маніторынгу Камітэта дзяржкантролю Беларусі. За мінулы год з выкарыстаннем інфармацыі Дэпартамента было пераведзена ў даход дзяржавы больш за 96 млрд рублёў. Акрамя таго, у выніку прыцягнення парушальнікаў да адміністратыўных штрафаў было даналічана 247 млрд рублёў падаткаў. Віталь Прасвіраў, начальнік упраўлення каардынацыі і міжнароднага супрацоўніцтва Дэпартамента фінансавага маніторынгу Камітэта дзяржкантролю Беларусі, падкрэсліў, што падобны семінар адбываецца ўпершыню. «Тэматыка выбрана невыпадкова: інфармацыйныя тэхналогіі — гэта аснова асноў фінансавай разведкі. Інфармацыйны абмен пасля далучэння Беларусі да Групы «Эгмант» вырас амаль у тры разы. Мы сталі атрымліваць значную інфармацыю фінансавага характару, якая тычыцца ў тым ліку правядзення падазроных фінансавых аперацый нашымі грамадзянамі, беларускімі прадпрыемствамі». Значнасць менавіта сферы ІТ пацвердзіў і расійскі спецыяліст — Валерый Шыбін, намеснік дырэктара Федэральнай службы па фінансавым маніторынгу (Расфінманіторынг). Ён расказаў, чыімі распрацоўкамі карыстаюцца фінансавыя разведкі: «Галіна інфармацыйных тэхналогій даўно стала ў свеце глабальнай, таму ў фінансавай разведцы выкарыстоўваюцца тэхналогіі розных краін. У гэтай галіне ёсць прызнаныя лідары, добра вядомыя замежныя кампаніі. Перш за ўсё кампанія Microsoft. Аднак і свае напрацоўкі мы таксама выкарыстоўваем».

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ, фота аўтара.

ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»

Група «Эгмант» — спецыялізаваная арганізацыя падраздзяленняў фінансавай разведкі. Атрымала назву па месцы правядзення ўстаноўчай канферэнцыі ў палацы Эгмант-Арэнберг у Брусэлі (Бельгія) у чэрвені 1995 года. Аб'ядноўвае больш за 130 фінансавых разведак дзяржаў свету. Асноўная мэта — падтрымка нацыянальных праграм па барацьбе з «адмываннем» грошай у частцы пашырэння абмену фінансавай інфармацыяй.

ЕАГ — створана ў 2004 годзе з мэтай сумесных высілкаў па барацьбе са злачынствамі ў фінансавай сферы і зніжэння пагрозы міжнароднага тэрарызму. У Групу ўваходзяць 9 дзяржаў, 14 з'яўляюцца назіральнікамі. З 2011 года ЕАГ атрымала статус міжурадавай арганізацыі. Дзейнасць накіравана на забеспячэнне бяспекі нацыянальных эканомік краін — удзельніц Групы, павелічэнне празрыстасці фінансавых сістэм, скарачэнне долі іх цянявога складніка, павышэнне інвестыцыйнай прывабнасці краін на міжнароднай арэне.

ФАТФ — заснавана ў 1989 годзе. Членамі зараз з'яўляюцца 34 краіны і 2 рэгіянальныя арганізацыі. ЕАГ з'яўляецца асацыяваным членам ФАТФ.

■ Надвор'е

ПАСВЯЖЭЕ, А Ў ВЫХАДНЫЯ — МОЦНЫЯ ДАЖДЖЫ

У аўторак атмасферны фронт з боку паўднёвага захаду Еўропы прынясе да нас кароткачасовыя дажджы, а месцамі і навальніцы, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

У сераду і чацвер тэрыторыя Беларусі трапіць у зону паніжанага атмасфернага ціску. Таму месцамі зноў пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Тэмпература паветра ўначы 7—14 цяпла, удзень у сераду — 18—24, у Гомельскай вобласці да плюс 26 градусаў. Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу і суботу да нас завітаюць актыўныя атмасферныя франты ад цыклона. Таму ў Беларусі паўсюдна чакаюцца дажджы, месцамі моцныя дажджы і навальніцы. Пры навальніцах узмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература ўначы будзе вагацца ад 9 да 16 цяпла, удзень — плюс 15—22 градусы, у крайніх паўночна-ўсходніх раёнах — 23—27 цяпла. Непрацяглыя дажджы чакаюцца месцамі і ў нядзелю. Пасвяжэе і ўдзень, калі прагназуецца 15—22, а ў Брэсцкай і Гомельскай абласцях — да плюс 24 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ

■

УЗНАГАРОДЫ — ЗА СЛУЖЭННЕ ПРАВУ

Імёны лепшых юрыстаў краіны вызначыла Міністэрства юстыцыі па выніках конкурсу імя Уладзіміра Спасовіча — выдатнага беларускага правазнаўца, публіцыста і літаратара, аўтара вядомых прац па тэорыі крымінальнага і аўтарскага права, якія ў XIX стагоддзі былі літаральна настольнымі кнігамі юрыстаў Расійскай імперыі і многіх краін Еўропы.

Як расказаў на адкрыцці цырымоніі ўзнагароджвання першы намеснік міністра юстыцыі Аляксандр Білейчык, Уладзімір Спасовіч яшчэ ў сярэдзіне пазамінулага стагоддзя заклікаў сваіх калег не толькі сумленна служыць праву, але і быць прапагандыстамі прававых ведаў сярод самых шырокіх колаў насельніцтва. Паводле слоў намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Валерыя Міцкевіча, стварэннем кодэксаў дасягнуць можна многага, але галоўнай была і будзе асветніцкая, выхаваўчая работа саміх юрыстаў і сродкаў масавай інфармацыі, якія гэтую работу адлюстроўваюць. Менавіта таму пры вызначэнні імён пераможцаў бралася пад увагу і іх актыўная грамадская работа па павышэнні прававой культуры ў краіне.

Лаўрэатамі конкурсу і ўладальнікамі галоўных прызоў у намінацыі «Суд» стаў суддзя Гаспадарчага суда Гродзенскай вобласці Сяргей Бяляўскі, у намінацыі «Навука і права» — загадчык кафедры крымінальнага права Белдзяржуніверсітэта Ігар Грунтоў, у намінацыі «Натарыят» — старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага схода Лілія Мароз, у намінацыі «Адвакатура» — калектыў Мінскай абласной спецыялізаванай юрыдычнай кансультацыі па аказанні прававой дапамогі суб'ектам гаспадарання.

Дыпломамі конкурсу ўганараваны і нашы калегі-журналісты. Сёлета лепшымі па прававым выхаванні былі прызнаны праграмы Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё і Гомельскай студыі тэлебачання.

Яшчэ адной мэтай конкурсу з'яўляецца павышэнне прэстыжу юрыдычнай прафесіі і навукі і спрыянне ўзмацненню ролі права ў грамадстве.

Пятро РАМАНЧУК.

КОШТ ПРАЕЗДУ Ў МІНСКУ ЗНОЎ ВЫРАСЦЕ

Пра верагоднасць павышэння да 2 тысяч рублёў сумы, якую даводзіцца аддаваць за квіток у грамадскім транспарце, «Звязда» пісала яшчэ ў сакавіку. Тады гэтая інфармацыя давалася толькі ў якасці прагнозу, ніхто не называў пэўных дат. Нядаўна ж у інтэрнэце з'явіліся звесткі, што плата за праезд усё ж такі падымецца, прычым чакаць гэтай падзеі засталося нядоўга.

Каб удакладніць інфармацыю, карэспандэнт «Звязды» звярнулася ў камунальнае транспартнае ўнітарнае прадпрыемства «Мінсктранс».

— Так, сапраўды, у перыяд з 25 мая па 1 чэрвеня адна паездка ў транспарце стане на 300 рублёў даражэйшай, — пацвердзіў **намеснік генеральнага дырэктара «Мінсктранса» Віктар ТОЗІК.**

У хуткім часе квіток ці жэтон у Мінску будзе каштаваць 2 тысячы рублёў. Праязныя, набытыя да павышэння, будуць лічыцца сапраўднымі. Папярэдняе павелічэнне кошту праезду ў сталічным транспарце было ў кастрычніку 2012 года.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

■ Актуальнае інтэрв'ю

СТРАТЭГІЧНАЯ МІСІЯ ЕЎРАЗІЙСКАГА САЮЗА — НОВАЯ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫЯ

Аб місіі Еўразійскага эканамічнага саюза, адносінах да гэтага інтэграцыйнага праекта міравых геапалітычных цэнтраў, а таксама пра прынцып непалітычнай інтэграцыі еўразійскай прасторы распавёў газеце «Звязда» генеральны дырэктар Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра «Наваком», дырэктар міжнароднага дэпартамента фонду «Расійскі грамадска-палітычны цэнтр» КАНДЗЯКОЎ Аляксандр Уладзіміравіч.

— Беларусь, Расія і Казахстан актыўна рухаюцца ў кірунку стварэння Еўразійскага эканамічнага саюза. Аднак у асяроддзі палітыкаў на міжнароднай арэне, у грамадскіх і экспертных колах стаўленне да гэтага геапалітычнага праекта неадназначнае, нярэдка — негатыўнае. Чым, на ваш погляд, гэта абумоўлена?

— Некаторыя эксперты і палітыкі, у тым ліку і былы дзяржсакратар ЗША Хілары Клінтан, бачаць у ідэі Еўразійскага саюза спробу «рэсаветызаваць» постсавецкую прастору і адрадзіць Савецкі саюз пад іншай назвай. Іншыя ацэньваюць гэты геапалітычны праект як спробу ўбудавацца ў еўраатлантычную супольнасць на больш выгаднай і раўнапраўнай для сябе аснове.

Але самая вялікая праблема Еўразійскага саюза заключаецца ў тым, што грамадства, простыя людзі не разумеюць, якую выгаду яны ад яго атрымаюць. Адсутнічае стратэгічнае бачанне таго, чым павінен з'яўляцца будучы Еўразійскі саюз. І калі казаць аб стратэгічным бачанні, я б нават сказаў: стратэгічная місія Еўразійскага саюза заключаецца ў тым, каб сумеснымі намаганнямі народаў Расіі, Беларусі і Казахстана, іншых дзяржаў правесці новую індустрыялізацыю еўразійскай прасторы, што ў выніку станоўча адаб'ецца на ўзроўні іх жыцця.

Пад новай індустрыялізацыяй маю на ўвазе не толькі паглыбленне кааператыўных сувязяў паміж прадпрыемствамі, стварэнне розных вертыкальных і гарызантальных холдынгавых структур праз аб'яднанне ўжо існуючых актываў (напрыклад, аб'яднанне МАЗ і КАМАЗ у холдынг «Расбелаўта» або інтэграцыя Мінскага завода колавых цягачоў у расійскі ваенна-прамысловы комплекс і г.д.), але перш за ўсё рэалізацыю сумеснымі намаганнямі новых транс'еўразійскіх інфраструктурных праектаў і стварэнне прамысловых навукаёмістых вытворчасцяў, накіраваных на засваенне новых тэхналогій. Менавіта таму на парадку дня стаіць задача па распрацоўцы спіса стратэгічных інвестыцыйных праектаў для іх сумеснай рэалізацыі на еўразійскай прасторы, у тым ліку з удзелам замежнага капіталу.

Што тычыцца стаўлення заходніх палітычных эліт да інтэграцыйных працэсаў на постсавецкай прасторы, то, безумоўна, Захаду не выгадны моцны Еўразійскі саюз. У той жа час Захад мае патрэбу ў Еўразійскім саюзе як прадказальным і кіраваным саюзніку.

— Нядаўна адбыўся візіт новага Старшыні КНР Сі Цзіньпіна ў Маскву, які эксперты ўжо ахрысцілі як стратэгічны паварот ва ўзаемаадносінах паміж Масквой і Пекінам. Між тым, у экспертных колах існуе меркаванне аб тым, што Расія і Кітай з'яўляюцца канкурэнтамі на еўразійскай прасторы, з-за чаго стратэгічны саюз паміж імі немагчымы.

— Сёння Расія і Кітай з'яўляюцца канкурэнтамі перш за ўсё ў цэнтральнаазіяцкім рэгіёне. Гэта вельмі выразна паказаў саміт Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва (ШАС) у чэрвені 2012 года, на якім расійскі і кітайскі бакі так і не дамовіліся аб стварэнні Фонду развіцця (спецыяльнага рахунку) ШАС і Банка развіцця ШАС. Дарэчы, такая ж доля спасцігла і ідэю стварэння Банка развіцця BRICS (Бразілія, Расія, Індыя, Кітай, Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка), якая абмяркоўвалася на сакавіцкім саміце. Гэта ператвараецца ў тэндэнцыю: Расіі і Кітаю цесна ў адных арганізацыях. Таму канкурэнцыя паміж імі непазбежная.

Пад новай індустрыялізацыяй маю на ўвазе не толькі стварэнне розных холдынгавых структур, але перш за ўсё рэалізацыю сумеснымі намаганнямі новых транс'еўразійскіх інфраструктурных праектаў і стварэнне прамысловых навукаёмістых вытворчасцяў, накіраваных на засваенне новых тэхналогій.

З іншага боку — з-за шэрагу гістарычных, геапалітычных фактараў Расія і Кітай на сённяшнім этапе проста асуджаны быць стратэгічнымі саюзнікамі. Аб гэтым, у прыватнасці неаднаразова заяўлялі кіраўнікі дзвюх краін. Ды і сам працэс стварэння і развіцця дзейнасці ШАС і BRICS стаў магчымым толькі на аснове стратэгічных дамоўленасцяў паміж Масквой і Пекінам.

Што тычыцца канкурэнцыі паміж Расіяй і Кітаем, то, з пункту гледжання пэўных колаў Захаду, Еўразійскі саюз тут можа разглядацца як інструмент паслаблення ўплыву Пекіна ў Цэнтральнай Азіі.

— Тады атрымліваецца, што Захаду выгадна, каб у Еўразійскі саюз увайшлі і іншыя цэнтральнаазіяцкія краіны, апроч Казахстана? Сёння найбольшыя перасцярогі эксперты выказваюць у сувязі з магчымасцю дэстабілізацыі палітычнай сітуацыі ў цэнтральнаазіяцкіх дзяржавах з-за дрэннага здароўя іх лідараў, а таксама з-за экспарту нестабільнасці з Афганістана пасля вываду войскаў НАТА ў 2014 годзе. Як гэта можа адбіцца на перспектывах будаўніцтва Еўразійскага саюза?

— Верагоднасць нестабільнасці сапраўды існуе, і, безумоўна, яна можа негатыўна адбіцца на еўразійскіх інтэграцыйных працэсах. Разумеючы, што рызыка дэстабілізацыі цэнтральнаазіяцкага рэгіёна вельмі вялікая, Расія імкнецца нарошчваць сваю палітычную, ваенную і эканамічную прысутнасць у цэнтральнаазіяцкіх дзяржавах. Зараз у чарзе на ўваходжанне ў Мытны саюз знаходзяцца Кыргызстан і Таджыкістан. Іх уваходжанне ў МС адпавядае інтарэсам як у сферы бяспекі, так і магчымасці рэалізацыі буйных эканамічных праектаў з удзелам расійскага капіталу.

— Некаторыя эксперты і палітыкі сёння асцерагаюцца, што пад відам эканамічнай інтэграцыі Масква спрабуе навязаць постсавецкім краінам інтэграцыю палітычную. Беларусь і Казахстан, напрыклад, негатыўна расцанілі прапанову Крамля стварыць Парламент Еўразійскага эканамічнага саюза. Магчыма, неабходна наогул адмовіцца ад ідэі стварэння адзінага палітычнага вымярэння ў будучым Еўразійскім эканамічным саюзе, таму што менавіта гэты аспект больш за ўсё насцярожвае палітычныя эліты — як тых, хто ўжо ўдзельнічае ў вышэйзгаданым інтэграцыйным праекце, так і палітычныя эліты патэнцыйных краін-членаў.

— Думаю, што моцны, палітычна кансалідаваны Еўразійскі саюз неабходны. Любы варыянт рэалізацыі гэтай інтэграцыйнай ініцыятывы ў больш слабым выглядзе нежыццяздольны.

Аднак гэта не значыць, што трэба ўжо заўтра ствараць адзіны ўрад, скарачаць суверэнныя паўнамоцтвы дзяржаў і гэтак далей. На самой справе вялікую ролю ў збліжэнні нашых краін можа адыграць прынцып непалітычнай інтэграцыі — гэта значыць, прамыя кантакты прадпрыемстваў, рэалізацыя сумесных інвестыцыйных праектаў. І тут важную ролю выконваюць розныя дзелавыя і бізнес-саветы і асацыяцыі двухбаковага і шматбаковага фарматаў. Таму гаворка павінна ісці ў першую чаргу аб стварэнні карпаратыўных і дзяржаўна-карпаратыўных структур, якія б выступалі лакаматывамі эканамічнай інтэграцыі на еўразійскай прасторы.

Яшчэ адным важным пытаннем з'яўляецца стварэнне інстытутаў стратэгічнага планавання, якія б маглі распрацоўваць і рэалізоўваць буйныя інфраструктурныя праекты, якія маглі б легчы ў аснову новай індустрыялізацыі.

Аднак, на мой погляд, галоўную ролю ў працэсе прасоўвання ідэі Еўразійскага саюза, рэальным фарміраванні гэтага аб'яднання павінна адыграць так званая «народная дыпламатыя». Маю на ўвазе перш за ўсё дзейнасць розных двух- і шматбаковых экспертных, грамадскіх, моладзевых арганізацый, саветаў, фондаў, здольных на ўзроўні шырокіх народных колаў, большасці кантынгенту выбаршчыкаў актыўна спрыяць ажыццяўленню мэт Еўразійскага саюза, ствараць неабходную аснову яго будучага функцыянавання і росквіту.

Арсеній СІВІЦКІ,
кіраўнік Цэнтра стратэгічных і знешнепалітычных даследаванняў, палітычны аглядальнік «Звязды».
Масква

■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

ВЕТЭРАНЫ ТЭЛЕФАНАВАЛІ І Ў ІНДЫЮ, І Ў ЗША

Кампанія «МТС» падвяла вынікі штогадовай сацыяльнай акцыі «Званок аднапалчаніну», якая прайшла ў Беларусі з 8 па 10 мая.

У гэтыя дні беларускія ветэраны, дзякуючы мабільнаму аператару, мелі магчымасць зрабіць бясплатныя званкі аднапалчанам, сваякам і сябрам у любую краіну свету. «Пунктамі перамоў» сталі ўсе салоны сувязі МТС, размешчаныя ў сталіцы, абласных і раённых цэнтрах. Таксама мабільныя перагаворныя пункты былі разгорнуты 9 мая на сталічных пляцоўках святочных мерапрыемстваў.

У кампаніі МТС адзначаюць, што сёлета ветэраны праявілі найбольшую актыўнасць за ўвесь час правядзення акцыі. Пасля падлікаў высветлілася, што ветэраны размаўлялі больш як 20 гадзін, а сярэдняя працягласць адной размовы складала 10 хвілін. Кожны ветэран у сярэднім рабіў 2 званкі.

Франтавікі шукалі сваіх аднапалчан ва Украіне, у Літве, Латвіі, Эстоніі, Узбекістане і Расіі. Беларусь выйшла на сувязь з такімі гарадамі, як Масква, Санкт-Пецярбург, Цвер, Новасібірск, Іркуцк, Варонеж, Белгарад, Волагда, Барнаул, Чалябінск, Разань, Іванава, Талін, Кіеў, Чарнігаў, Адэса. Таксама ветэраны тэлефанавалі ў Індыю, ЗША, Ізраіль і Вялікабрытанію. Самымі актыўнымі аказаліся ветэраны ў Мінску, Брэсце і Гомелі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ДЗЕВА НА МАНЕЦЕ

Нацбанк учора увёў у абарачэнне сярэбраную памятную манету «Дзева. 2013 (Virgo. 2013)» серыі «Знакі задыяка. 2013» наміналам 20 рублёў, пробай сплаву 925 з пакрыццём золатам пробы 999,9, масай 28,28 грама, дыяметрам 41 міліметр.

Манета адчаканена на Манетным двары Польшчы якасцю «пруф» з пазалотай, тыражом да 10000 штук, паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка Беларусі.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

«ІМКЛІВЫ МЯЧ» У ГРОДНЕ

На спартыўных пляцоўках горада над Нёманам прыярытэт на гэтым тыдні ў «Імклівага мяча» — так называюцца рэспубліканскія спаборніцтвы па гандболе сярод юнакоў і дзяўчат 2000-2001 гадоў нараджэння.

На першых этапах спаборнічалі агульнаадукацыйныя, дзіцяча-юнацкія спартыўныя школы. А фінальны турнір у Гродне сабраў 16 каманд з усіх абласцей і сталіцы. Прычым ім даецца магчымасць не толькі паспаборнічаць, але і паназіраць за «бітвай тытанаў» айчыннага жаночага гандбола — матчам «Гараднічанка»-«БНТУ-БелАЗ», які выявіць чэмпіёна краіны. Арганізатары спаборніцтваў, сярод якіх Беларуская федэрацыя гандбола, Прэзідэнцкі спартыўны клуб, БРСМ, органы выканаўчай улады, падрыхтавалі шмат прызоў — не толькі пераможцам і прызёрам, але і лепшым у розных намінацыях. На цырымоніі ўрачыстага адкрыцця турніру ўзнагародзілі і ветэранаў беларускага гандбола.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ПАЖЫЛЫЯ НЕ МОГУЦЬ ЗА СЯБЕ ПАСТАЯЦЬ

Праваахоўнікі наведаюць на гэтым тыдні ўсіх састарэлых, якія пражываюць з асацыяльнымі асобамі, для прафілактыкі проціпраўных дзеянняў. Па ініцыятыве Міністэрства ўнутраных спраў у рэспубліцы праводзіцца спецыяльнае комплекснае мерапрыемства «Увага — узрост!».

Як паведамляюць ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, на тэрыторыі краіны ў апошнія чатыры месяцы назіралася зніжэнне колькасці пенсіянераў, якія пацярпелі ад зламыснікаў. Тым не менш, сталыя людзі нярэдка становяцца ахвярамі тых жа маёмасных злачынстваў. Прычым часцей за ўсё з-за ўласнай неабачлівасці. Аднак ёсць факты цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў. Так, у Гродзенскай вобласці непрацуючы сын не толькі жорстка збіў сваю маці, але і спрабаваў спаліць яе ва ўласным доме. З мноствам апёкаў жанчыну шпіталізавалі. Падазроны затрыманы. А ў Мінскай вобласці непрацуючы і неаднаразова судзімы задушыў пажылую жанчыну. Рэцыдывіста таксама затрымалі.

Святлана БАРЫСЕНКА.

СТАВІЎ СЕТКІ Ў... СТАЛІЦЫ

Рабочы мінскага завода ноччу выправіўся на рыбалку на вадаём, размешчаны на тэрыторыі Цэнтральнага раёна сталіцы. Гэта пры тым, што, як потым высветлілася, цудоўна ведаў: зараз дзейнічае забарона на лоўлю ўсіх відаў рыбы.

Больш за тое, рыбачыць мінчанін стаў пры дапамозе сетак — забароненых прылад лоўлі. У іх трапілі 89 плотак і 3 судакі. Толькі паспеўшы дастаць улоў, «рыбак» сам папаўся ў рукі супрацоўнікаў Цэнтральнага РУУС. Матэрыялы праверкі перададзены ў раённы аддзел Следчага камітэта для дачы прававой ацэнкі. Мінчаніну пагражае прыцягненне да крымінальнай адказнасці.

Сяргей РАСОЛЬКА.

МАЛАНКА — ПРЫЧЫНА ПАЖАРУ

— У расонскае падраздзяленне МНС ад відавочцы паступіла паведамленне аб пажары ў цэху па вытворчасці паліўных брыкетаў прыватнага гандлёвага вытворчага ўнітарнага прадпрыемства, — паведамілі ў Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях. — Агнём было знішчана 40 тон паліўных брыкетаў і дах будынка, пашкоджаны сцены. Пацярпелых няма. Як мяркуецца, прычына пажару — удар маланкі.

У ХРАМ УРЭЗАЎСЯ ГРУЗАВІК

У гістарычным цэнтры Віцебска на вуліцы Суворава а чацвёртай гадзіне дня «МАЗ», гружаны шчэбнем, урэзаўся ў будынак праваслаўнай царквы.

— Аўтамабіль, які выкарыстоўваецца для рамонту дарог, належыць камунальнаму ўнітарнаму рэспубліканскаму дзяржаўнаму прадпрыемству «Гардармост» Віцебска. Аўто быў прыпаркаваны па вуліцы Леніна. Раптам грузавік пачаў самаадвольны рух уніз, перасек пешаходны тратуар, сутыкнуўся з бетоннай лесвіцай і агароджай храма Уваскрэсення Хрыстова і перакуліўся, — паведамілі ў Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях. — У кабіне аўтамабіля знаходзіўся дарожны рабочы 1971 года нараджэння. Мужчына атрымаў удар правага вока. Пацярпелага даставілі ў бальніцу. Пасля таго, як яго агледзелі медыкі, ён быў адпушчаны дадому. Рух аўтатранспарту не спыняўся.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

НАПАЎ З НАЖОМ НА ТАКСІСТА

У сталіцы па «гарачых слядах» затрымалі 17-гадовага падазронага ў разбойным нападзе на таксіста.

— Позна ўвечары малады чалавек спыніў таксі на вуліцы Астрашыцкай і папрасіў кіроўцу давесці яго да вакзала. Калі машына праязджала каля станцыі метро «Маскоўская», пасажыр, які сядзеў ззаду, раптоўна пачаў душыць кіроўцу. Той хутка затармазіў і аказаў актыўнае супраціўленне. Тады нападаўшы дастаў нож. У схватцы кіроўца змог выбіць зброю, пасля чаго налётчык выскачыў з машыны і збег, — расказала прэс-афіцэр Першамайскага РУУС г. Мінска Вольга Куцько. — Кіроўца адразу ж выклікаў міліцыю. Падобнага па прыкметах маладога чалавека непадалёку ад аўтавакзала «Маскоўскі» ўбачылі міліцыянеры раённага аддзела дэпартамента аховы. Заўважыўшы службовы аўтамабіль, той кінуўся бегчы. Тым не менш падазроны быў затрыманы. У райаддзеле ён распавёў, што разам з кампаніяй прыехаў у Мінск з суседняй краіны для пакупкі аўтамабіля. У горадзе адстаў ад таварышаў, знайсці іх не змог. Каб з'ехаць назад, патрэбны былі грошы. А нож ён украў у гаспадарчай краме.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДЫПЛАМАТЫЯ ГАРАДОЎ

Гэтымі днямі латвійскі горад Даўгаўпілс (дарэчы, другі па велічыні ў гэтай прыбалтыйскай краіне) стаў цэнтрам садружнасці дзвюх суседніх краін — Беларусі і Латвіі. Тут прайшоў II латвійска-беларускі форум гарадоў-пабрацімаў. Гэта, можна сказаць, працяг дружалюбных і дзелавых сустрэч у Наваполацку, якія адбыліся ў такім жа фармаце на Віцебшчыне летась.

Менавіта з падабенства краін па многіх пазіцыях пачала сваё выступленне старшыня Даўгаўпілскай гарадской думы Жанна Кулакова. У прыватнасці, яна адзначыла, што Беларусь у свеце вядома як «культуралагічная» краіна дзякуючы знакамітаму мастаку Марку Шагалу, а Латвію нямала людзей ведаюць па работах майстра пэндзля Марка Ротко. У прамове былі ўзняты тэмы прыгранічнага супрацоўніцтва, садзейнічання развіццю турызму, малому і сярэдняму бізнесу, чыгуначным перавозкам, транспартнаму калідору па аўтамабільных дарогах, культурнаму ўзаемадзеянню.

Выступоўца адзначыла, што Беларусь — найважнейшы эканамічны партнёр Латвіі. І калі ў 2004 годзе агульны аб'ём тавараабароту склаў каля 400 мільёнаў долараў, то на канец мінулага года гэты паказчык перакрыты амаль у 10 разоў.

Старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Барыс Батура, які з'яўляецца старшынёй савета гарадоў-пабрацімаў, у сваім выступленні адзначыў важнасць сумеснай працы ў самых розных кірунках — культурна-гістарычным, сельскагаспадарчым, прамысловым, паліўна-энергетычным. Паводле яго слоў, толькі ў 2012 годзе ў Беларусь было прыцягнута інвестыцый з Латвіі ў суме каля 130 мільёнаў долараў. Сёння на тэрыторыі братняй прыбалтыйскай краіны дзейнічае каля 70 прадпрыемстваў з удзелам беларускага капіталу, а ў Рэспубліцы Беларусь «прапісалася» каля 200 фірмаў, дзе працуюць латвійскія грошы.

Кіраўнік беларускага дыпламатычнага прадстаўніцтва ў Латвіі Аляксандр Герасіменка адзначыў важнасць Беларусі як партнёра Латвіі ў загрузцы партоў. Паводле слоў Аляксандра Міхайлавіча, доля беларускіх грузаў на латвійскай чыгунцы складае звыш 56 працэнтаў, а латвійскіх у Беларусі — каля 23 працэнтаў. Вынік прамовы Аляксандра Герасіменкі на латвійска-беларускім форуме наступны: трэба выкарыстоўваць па максімуме магчымасці супрацоўніцтва і ў будучыню неабходна ісці разам.

Двухдзённы саміт дэлегатаў гарадоў-пабрацімаў у Даўгаўпілсе, акрамя пратакольнай часткі афіцыйнага пасяджэння, — гэта і шэраг дзелавых сустрэч на прадпрыемствах Даўгаўпілса, на агульнай выставе латвійскіх і беларускіх рэгіёнаў і прадпрыемстваў, на кірмашы рамеснікаў і канцэрце мастацкай самадзейнасці калектываў дзвюх краін, на пасяджэнні «круглага стала» парламентарыяў на тэмы ўмацавання дружалюбных сувязяў...

Максім УЛАДЗІМІРАЎ, *Даўгаўпілс.*
Фота аўтара.

«МЫ АДКРЫЛІ ТАКІХ БЕЛАРУСКІХ КАМПАЗІТАРАЎ, ЯКІХ НАВАТ Я НЕ ВЕДАЎ!»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Канцэптуальна сёлетні фэст нічым не адрозніваецца ад папярэдніх. Зрэшты, і задачы ствараць нешта кардынальна новае зусім не было. Нават наадварот.

— Мы не планавалі рабіць нейкае шоу або кардынальна мяняць праграму, — тлумачыць **дырыжор Міхаіл ФІНБЕРГ.** — Нашая задача зусім не ў гэтым. А ў тым, каб захаваць спадчыну, традыцыю. А яны, як вядома, нязменныя. За столькі гадоў нашай працы нам удалося выхаваць самых чуйных і дасведчаных слухачоў — нясвіжан. Гэтая аўдыторыя ведае ўсю гісторыю беларускай класічнай музыкі. Нам вельмі падабаецца выконваць музыку ў маленькіх гарадах Беларусі. І сёлетні фестываль — гэта 163-е выступленне нашага аркестра ў маленькіх гарадах. У адной толькі Мінскай вобласці ў нас 4 фестывалі: Нясвіж, Маладзечна, Любань, Заслаўе.

Ведаючы, з якімі арганізацыйнымі і фінансавымі цяжкасцямі змагаўся фестываль у розныя гады, немагчыма не здзівіцца яго жывучасці і таму, што адбываецца ён заўжды ў адзін і той жа час. Фінберг любіць жартаваць, што «Музы Нясвіжа» ладзяцца адразу пасля таго, як беларусы пасадзілі бульбу на майскія святы. Але калі 18 гадоў таму фэст толькі пачынаўся, было зусім не да жартаў.

— Памятаю, як да мяне прыйшоў Міхаіл Фінберг і расказаў пра ідэю такога фестывалю, — узгадвае **Вольга ДАДЗІЁМАВА, доктар мастацтвазнаўства, прафесар і нязменная вядучая фэсту.** — Тады я паглядзела на яго як на дзівака і нават нотамі спачатку не хацела дзяліцца. Да таго ж гэта быў і нібыта не яго профіль: аркестр спецыялізаваўся пераважна на папулярнай і джазавай музыцы. Але ўбачыўшы апантанасць маэстра, я падумала, што варта паспрабаваць. І вось што ў нас атрымалася. І мы вельмі ўдзячныя Міністэрству культуры, Мінаблвыканкаму і Нясвіжскаму райвыканкаму за шчырую падтрымку.

Адна з найгалоўнейшых цяжкасцяў у тым, што большасць беларускай музыкі страчана. І менавіта Вольга Дадзіёмава, асноўным месцам працы якой з'яўляецца Акадэмія музыкі, літаральна па радках і знаках вяртае беларускія ноты са сховішчаў розных краін. Звычайна яна акцэнтуе ўвагу на тым, што Нясвіж заўсёды знаходзіўся ў цэнтры музычнай культуры Еўропы, таму нашы ноты можна знайсці па ўсім свеце.

— Калі мы толькі пачыналі, пра Радзівілаў нават казаць было непрыстойна. Не тое што выконваць іх музыку. Радзівілаў лічылі «крывасмокамі і феадаламі», — гаворыць Вольга Дадзіёмава. — Але я пераканана, што сваё не можа быць кепскім. Так мы адкрылі і музыку Радзівілаў, і Яна Голанда, опера якога сёння ідзе на беларускай сцэне, і шмат іншай музыкі.

— Мы адкрылі такіх беларускіх кампазітараў, якіх нават я не ведаў! — радуецца Міхаіл Фінберг. — Таму што калі я вучыўся ў кансерваторыі, то гісторыю музыкі праходзілі толькі з 1917 года. Шмат беларускіх нот XIX і XX стагоддзяў былі страчаны. Але сёння дзякуючы Вользе Дадзіёмавай мы ведаем музыку нават XVI — XVII стагоддзяў.

Дарэчы, асветніцкі характар фестывалю з навуковым падмуркам «Музы Нясвіжа» не толькі ў тым, што ў рамках гэтага свята мастацтваў літаральна ўпершыню на Беларусі гучаць некаторыя старажытныя шэдэўры музыкі нашай краіны. А яшчэ і ў тым, што кожны канцэрт — гэта бадай што паўнавартасная лекцыя па гісторыі музыкі, прыпраўленая эксклюзіўнымі фірменнымі цікавінкамі ад Вольгі Дадзіёмавай. Так, прадстаўляючы мелодыю Аляксея Туранкова, яна распавядае гісторыю пра знакамітага беларускага скрыпача Яна Гарэліка; перад выкананнем адажыа з балета «Маленькі прынц» Яўгена Глебава расказвае пра сусветны кантэкст; а перад выкананнем музыкі Генрыха Вагнера ўзгадвае пра Моцарта. І аказваецца, што знакаміты і несмяротны кампазітар хоць і ўскосна, але звязаны з Беларуссю. Калі Моцарт пісаў сваю «Жаніцьбу Фігара» наш Ян Голанд пісаў сваю «Агатку». І музыказнаўцы, параўнаўшы гэтыя творы, знайшлі вельмі многа чыста музычных падабенстваў і сугуччаў. Уся справа ў тым, што тады Нясвіж сапраўды быў у цэнтры музычнай Еўропы і мы мелі адзін гукавы фонд з Еўропай. Адсюль і такая еднасць «Фігара» і «Агаткі». Дарэчы, і яшчэ адзін геніяльны кампазітар эпохі барока Іаган Себасцьян Бах таксама мае ўскоснае дачыненне да Беларусі. Ён прысвяціў сваю «Месу мі мінор» каралю Рэчы Паспалітай Аўгусту III.

Калектыў аркестра ансамбль трубачоў «Інтрада» (мастацкі кіраўнік — прафесар Мікалай Волкаў) выканаў музыку Мечыслава Карловіча і знакамітую «Польку» Мікалая Чуркіна. А вялікі канцэрт у Нясвіжскім цэнтры культуры і адпачынку быў прысвечаны еўрапейскай музыцы. У выкананні ансамбля кларнетыстаў (мастацкі кіраўнік — дацэнт Генадзь Забара) прагучаў «Менуэт» і «Вечаровая серэнада» Франца Шуберта, «Танец сільфаў» Лероя Андэрсана, музыка Жоржа Бізэ і шмат іншай. У тэатральнай зале Нясвіжскага палаца адбыўся канцэрт «Вяртанне ў Нясвіжскі замак: Радзівілы і музычны свет», на якім прагучала шмат твораў часоў росквіту старажытнага беларускага роду.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.
Нясвіж — Мінск.

Фотаздымкі БЕЛТА.

«З чаго складаецца мой заробак?»

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

З вёскі Селішча Чэрыкаўскага раёна на «гарачую лінію» газеты звярнулася са скаргай на нізкую зарплату жанчына — аператар машыннага даення, якая працуе ў СВК «Язерскі». Заяўніца гаварыла, што за апошнія месяцы ў сярэднім выходзіла па 1,3 мільёна рублёў. Быццам бы работнікі не ведаюць расцэнак і не разумеюць, адкуль бяруцца канчатковыя лічбы налічанай заработнай платы.

Ва ўпраўленні сельскай гаспадаркі і харчавання Чэрыкаўскага райвыканкама ў адказ на наш запыт запэўнілі, што паказчыкі працы работнікаў гаспадаркі вывешваюцца для азнаямлення штомесяц. А потым даслалі падрабязны разлік заработнай платы аператара машыннага даення за адзін з месяцаў.

Норма загрузкі для гэтага работніка склала ў ім 40 галоў. Расцэнкі на момант звароту былі агучаны наступныя: за адзін цэнтнер малака гатунку «экстра» і вышэйшага — 7 000, за першы гатунак — 5 385, другі гатунак — 3 000 рублёў. Нашай заяўніцай у «справаздачны» перыяд было надоена 44,79 цэнтнера малака гатунку «экстра» і вышэйшага, 2,187 цэнтнера першага і 17,22 цэнтнера — другога гатунку. У выніку, з улікам вышэйназваных расцэнак, работніцы за надой малака было налічана 482 959 рублёў.

За ўтрыманне адной цялушкі плацяць 7 545 рублёў. «У гэтай групе было 16 галоў». У выніку за месяц дадаткова налічана яшчэ 120 720 рублёў. За прывагу цялят прафілактарнага перыяду да 20-дзённага ўзросту, з улікам існуючых расцэнак (а прывага склала 1,2 цэнтнера) налічана было 153 622 рублі. З улікам святочных, санітарнага дня, класнасці (151 460 рублёў), каэфіцыенту працоўнага ўдзелу (50 працэнтаў — 378 650 рублёў), даплатай за стаж (8 працэнтаў — 39 360 рублёў) выніковая сума заработнай платы за месяц склала 1 435 620 рублёў.

Эканамісты ўпраўлення сельскай гаспадаркі і райвыканкама былі здзіўлены, чаму работніца не звярнулася найперш да іх па тлумачэнні, а патэлефанавала ў рэдакцыю.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Навіны сталіцы

У МІНСКУ НАЛІЧВАЕЦЦА 26 ТЫСЯЧ ВАКАНСІЙ

У базе звестак вакансій гарадской службы занятасці на 1 мая гэтага года налічвалася 26 тыс. вакансій.

Як расказала начальнік аддзела рынку працы і арганізацыі новых працоўных месцаў камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Святлана Лявончык, у сталіцы назіраецца дысбаланс попыту і прапановы на рынку працы. Адна з прычын — неадпаведнасць чаканняў людзей па ўзроўні зарплат і ўмовах працы з тым, што прапаноўваюць наймальнікі. Але пры гэтым ёсць свабодныя працоўныя месцы і з зарплатай 8 млн руб., на якія работадаўцы знаходзяць прэтэндэнтаў з вялікай цяжкасцю. Напрыклад, унітарнае прадпрыемства «Белкаапзнешгандаль Белкаапсаюза».

— Мы гатовы плаціць такія грошы, — пацвердзілі на прадпрыемстве, — але моцнаму прафесіяналу. Пакуль шукаем.

«Мінск-Навіны»

МЕТРАЛОГІЯ Ў ПАЎСЯДЗЁННЫМ ЖЫЦЦІ

Без эталонаў вымярэння мы не падлічым колькасць ужытай электраэнергіі, не ўзважым тавар і нават не пройдзем медыцынскае абследаванне

20 МАЯ СУСВЕТНАЕ МЕТРАЛАГІЧНАЕ ТАВАРЫСТВА АДЗНАЧАЕ СВАЁ ПРАФЕСІЙНАЕ СВЯТА.

Пачатак святу паклала падпісанне ў 1875 годзе Метрычнай канвенцыі, калі дыпламаты 17 краін дамовіліся вымяраць адлегласць у метрах, час — у секундах, а масу — у кілаграмах. Так нарадзілася міжнародная сістэма адзінак вымярэння.

Па ініцыятыве Метрычнай канвенцыі і Міжнароднай арганізацыі заканадаўчай метралогіі тэмай Сусветнага дня метралогіі ў 2013 годзе стала «Вымярэнне ў паўсядзённым жыцці». Гэта ўказвае на тое, што якасныя вымярэнні цэняцца ва ўсім свеце і запатрабаваны ўсім грамадствам.

ПАТРЭБНЫ СВАЕ ЭТАЛОНЫ

Беларускі дзяржаўны інстытут метралогіі сумесна з навуковымі і прамысловымі ўстановамі Беларусі рэалізуе праекты па стварэнні эталонаў. Дакладнасць нацыянальных эталонаў у поўнай меры адпавядае міжнародным патрабаванням. Эталоны, якімі валодае рэспубліка, аднаўляюць значэнні такіх асноўных адзінак, як даўжыня, маса, час і частата, тэмпература, сіла святла, а таксама шэрагу іншых адзінак у галіне фізіка-хімічных, аптычных, акустычных, электрычных, радыёэлектронных велічынь, вымярэнняў ціску і расходу, іанізуючых выпраменьванняў.

Вучоны захавальнік Нацыянальнага эталона адзінкі электрычнай магутнасці Марына ЕРМАЛОВІЧ.

Вядучаму інжынеру аддзела вымярэнняў механічных велічынь Святлане БАБАРЫЦЫ даручана паверка электронных вагаў.

Аўдыялагічны комплекс — навінка сектара акустычных вымярэнняў і сродкаў неразбуральнага кантролю. Тут заняты вядучы інжынер Анатоль ВАЛОДЧАНКА.

Так выглядае «штучнае вуха» — важны элемент аўдыялагічнага комплексу.

— У кожнага ў карыстанні ёсць, скажам, электралічыльнік, які падлічвае колькасць спажытай намі электраэнергіі, — расказвае **дырэктар рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Беларускі дзяржаўны інстытут метралогіі», доктар тэхнічных навук Мікалай ЖАГОРА.** — І сёння ствараецца адпаведная вымяральная сістэма. Лічыльнік, установлены ў жылым доме, звязаны з жыллёва-эксплуатацыйнай службай. Адтуль уся інфармацыя паступае ў цэнтралізаваную базу. Аднак напарадзе нас чакае стварэнне дасканалай, як прынята казаць, інтэлектуальнай сістэмы энергазабеспячэння. Усе новыя дамы ўжо аснашчаюцца электроннымі лічыльнікамі, якія маюць мадэмы для сувязі са знешнім спажыўцом, і індыкатар, каб можна было пабачыць расход. Як толькі паўсюдна ў нашых дамах электрычныя лічыльнікі будуць заменены на электронныя, можна будзе гаварыць аб пачатку стварэння менавіта інтэлектуальнай сістэмы. Распрацоўкай эталонаў для бытавых элетралічыльнікаў займаецца адна з нашых лабараторый.

Іншая наша лабараторыя — механічная — распрацавала, напрыклад, вагавы эталон. Быў час, калі тавар узважвалі з дапамогай гуськовых вагаў і гір, потым вагі сталі цыферблатнымі, а сёння яны электронныя і ўвязаныя ў агульную інфармацыйна-разліковую сістэму гандлёвага прадпрыемства. На касе магазіна можна размясціць адначасова вагі, касавы апарат і апарат счытвання штрых-кода. Дастаткова пакласці тавар на вагі, як тут жа ў касавы апарат паступіць уся неабходная інфармацыя, а спажывец атрымае чэк з указаннем масы тавару і кошту.

Наш інстытут спрыяе таксама паступоваму развіццю сістэмы нагляду папярэдне фасаванага тавару. Гэта, так бы мовіць, праверка правільнасці фасоўкі тавару ў адсутнасці пакупніка. У Еўропе, Расіі і ў нас на некаторых таварах можна пабачыць спецыяльныя значкі, якія сведчаць аб тым, што тавар, які расфасаваў вытворца або гандлёвае прадпрыемства, пераправеран і адпавядае стандарту. Дарэчы, кожная адзінка тавару неабавязкова павінна строга адпавядаць маркіроўцы. Скажам, ва ўпакоўцы можа быць на 1-3 грамы менш ці больш, чым пазначана на этыкетцы. Аднак калі мы возьмем усю партыю гэтага тавару і вызначым яго агульную вагу, то апошняя не павінна быць меншай, чым намаркіравана.

Інстытут ініцыяваў і стварэнне сістэмы метралагічнага забеспячэння аўдыяметрычнага абсталявання. У свабодным акустычным полі (спецыяльным заглушаным памяшканні, дзе сцены максімальна паглынаюць гук) даследуецца апаратура, з дапамогай якой правяраецца слых, а менавіта аўдыёметры і тымпанометры. У нас праводзіліся ўсе належныя работы па нарматыўным і метадычным забеспячэнні метралагічнага кантролю аўдыяметрычнага абсталявання: распрацоўваліся нацыянальныя стандарты, методыкі паверкі на адпаведнае абсталяванне. Зараз актыўна развіваюцца метады аб'ектыўнай аўдыяметрыі, заснаваныя на ўздзеянні на слыхавыя нервы кароткачасовымі сігналамі і рэгістрацыі водгукаў на акустычнае раздражненне. Для правядзення такіх работ мы набылі спецыялізаванае эталоннае абсталяванне. І цяпер можна гаварыць аб удасканаленні сістэмы аўдыяметрычнага кантролю, павышэнні якасці адпаведных даследаванняў.

Сёння ва ўсім свеце актуальныя праблемы кантролю ўльтрагукавога медыцынскага абсталявання. Паводле ацэнак, каля 30 працэнтаў апаратаў ультрагукавой тэрапіі, якія знаходзяцца ў эксплуатацыі ў айчынных і замежных клініках, не адпавядаюць даным, заяўленым вытворцам. Стварэнне ў нашым інстытуце эталоннага комплексу для метралагічнага забеспячэння ўльтрагукавога даследавання спрыяе ажыццяўленню бяспечнай дыягностыкі, паколькі дазваляе кантраляваць адзін з важнейшых параметраў акустычнай бяспекі — магутнасць ультрагукавога выпраменьвання. Дзякуючы эталоннаму абсталяванню ў краіне з'явілася магчымасць развіваць такі перспектыўны кірунак, як спрошчаныя метады кантролю дыягнастычнага ўльтрагукавога абсталявання, калі тэхнічны стан абсталявання правяраецца непасрэдна ў клініцы.

Зразумела, што ўсё новае абсталяванне і прыборы ў абавязковым парадку правяраюцца з дапамогай нашых эталонных сістэм на адпаведнасць нашым стандартам. Далей, калі абсталяванне знаходзіцца ў эксплуатацыі, частата праверак вызначаецца або заканадаўствам, або тымі арганізацыямі, якія яго эксплуатуюць...

МЕТРАЛОГІЯ — гэта, па сутнасці, тое, без чаго немагчыма ўявіць ні эканамічнае, ні навуковае, ні культурнае развіццё любой краіны. Што да метралогіі айчыннай, то яе навукова-тэхнічны патэнцыял дазваляе забяспечваць спрыяльныя ўмовы для пражывання людзей, рацыянальнага выкарыстання рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Нацыянальны метралагічны інстытут і метралагічныя службы прадпрыемстваў павышаюць узровень навуковых даследаванняў, паляпшаюць якасць прадукцыі і сацыяльнага абслугоўвання.

Паверку лічыльнікаў электраэнергіі праводзіць інжынер Алена БАЕНСКАЯ.

ВАЖНА ДЛЯ ЭКАНОМІКІ

Сёлета на 1 студзеня рэспубліка налічвала 39 нацыянальных і зыходных эталонаў. Аднымі з апошніх сістэму нацыянальных эталонаў папоўнілі Нацыянальны эталон адзінкі энергіі згарання — джоўль і эталонны комплекс для метралагічнага забеспячэння ўльтрагукавога медыцынскага абсталявання.

— Стварэнне Нацыянальнага эталона адзінкі энергіі згарання — джоўль — гэта магчымасць эканоміі энергарэсурсаў, развіццё энергетыкі, паляпшэнне якасці энерганосьбітаў, — адзначае **начальнік аддзела тэмпературных і цеплафізічных вымярэнняў Беларускага дзяржаўнага інстытута метралогіі Пётр КРЫВАНОС.** — Высокадакладныя вымярэнні, якія ажыццяўляюцца з дапамогай эталона, запатрабаваны пры аналізе кампанентнага складу энерганосьбітаў, што дазваляе вызначыць энергетычны патэнцыял вадкага і цвёрдага паліва і магчымасць яго выкарыстання ў якасці крыніцы энергіі. Гэта прымяняецца пры рашэнні вымярэнняў інавацыйных тэхналогій для атрымання новых відаў паліва, пры даследаванні мясцовых відаў паліва, такіх, як торф, дрэўнае паліва, біяпаліва, выкарыстанне якіх у жыллёва-камунальнай гаспадарцы значна эканоміць ужыванне дарагога прыроднага газу ці мазуту...

НЯМА МЕЖАЎ ДЛЯ ЎДАСКАНАЛЕННЯ

Удасканаленне эталоннай базы, планамернае стварэнне новых эталонаў адзінак велічынь, здольных на парадак павысіць узровень дакладнасці вымярэнняў на ўсіх ступенях перадачы памеру адзінак, — гэта патрабаванне прамысловасці і любой іншай галіны, для якой дакладныя вымярэнні адыгрываюць важную ролю. Работа па стварэнні і мадэрнізацыі эталоннай базы працягваецца ў межах Дзяржаўнай навукова-тэхнічнай праграмы «Эталоны Беларусі» на 2011–2015 гады.

Святлана БАРЫСЕНКА, Алена ДАЎЖАНОК.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

УНП 100055197

■ Будзь у курсе!

СТРАЧКІ — ГРЫБЫ ЯДАВІТЫЯ, А НЕ ЎМОЎНА ЯДОМЫЯ!

Грыбны сезон у Беларусі яшчэ не паспеў стартаваць, аднак колькасць ахвяр атручэння грыбамі дасягнула ўжо 13 чалавек. Дзевяць пацярпелых з'яўляюцца жыхарамі сталіцы, і трое — жыхарамі Брэстчыны.

Усе пацярпелыя, па іх словах, спажывалі ў ежу кансерваваныя і сушаныя ядомыя грыбы (апенькі, сыраежкі, баравікі), якія мелі падабенства з умоўна ядомымі і ядавітымі грыбамі, а таксама смаржкі і страчкі. Смаржкі і страчкі традыцыйна з'яўляюцца ў беларускіх лясах менавіта вясной.

Між іншым, згодна з апошнімі данымі, страчкі адносяцца не да ўмоўна ядомых грыбоў, як гэта лічылася раней, а да ядавітых. Смаржкі ж можна спажываць толькі пасля працяглай тэрмічнай кулінарнай апрацоўкі. Абодва гэтыя віды грыбоў змяшчаюць небяспечны яд — гельвелавую кіслату. Акрамя таго, у страчках таксама змяшчаецца і такі моцны яд, як гірамітрын, які не разбураецца і не пераходзіць у адвар, нават пры працяглым кіпячэнні.

Для таго, каб пазбегнуць атручэння грыбамі, спецыялісты раяць выконваць элементарныя правілы прафілактыкі: збіраць толькі ядомыя грыбы (для засваення гэтай «навукі» існуюць спецыяльныя даведнікі ядомых і ядавітых грыбоў); не збіраць і не набываць на рынку старыя, пашкоджаныя лічынкамі і цвіллю грыбы; не спрабаваць грыбы на смак; не збіраць грыбы ўздоўж дарог: памятаць, што грыбы — прадукт, які хутка псуецца, таму адкладваць іх апрацоўку нельга. Саліць, сушыць і марынаваць кожны від грыбоў трэба асобна. Пасля адварвання грыбоў ваду трэба абавязкова зліваць. Катэгарычна нельга набываць у прыватнікаў грыбныя кансервы, выраблены ў хатніх умовах, а таксама сухія грыбы, грыбную ікру і розныя салаты з грыбамі.

Надзея НІКАЛАЕВА

■

МАЗ-«ШКОЛЬНІК» ПРЫЗНАНЫ ЛЕПШЫМ У «СВЕЦЕ АЎТОБУСАЎ»

Штогод падмаскоўная Каломна збірае вытворцаў з дзясяткаў краін на традыцыйны фестываль «Свет аўтобусаў». Сёлета наш МАЗ таксама пабываў там са сваімі навінкамі. У адным з конкурсаў фестывалю ў намінацыі «Лепшы маршрутны аўтобус» пераможцам быў названы школьны аўтобус МАЗ 241. Перамога тым больш ганаровая, што ў фестывалі ўдзельнічала каля ста экспанентаў з дваццаці краін.

Як расказалі рэдакцыі ў прэс-службе прадпрыемства, МАЗ разам са сваімі афіцыйнымі прадстаўнікамі ў Расійскай Федэрацыі выставіў чатыры мадэлі беларускіх аўтобусаў: МАЗ 203, МАЗ 206, МАЗ 231 і МАЗ 241 у школьным выкананні, якія на працягу ўсіх выставачных дзён карысталася вялікай папулярнасцю наведвальнікаў. Беларускія вытворцы правялі таксама выніковыя перамовы аб пастаўцы аўтобусаў сярэдняга класа МАЗ 206 і МАЗ 226 з кіраўніцтвам транспартнага комплексу Маскоўскай вобласці. Але школьнай версіяй зацікавіліся многія расійскія рэгіёны.

Як вядома, першыя ўзоры «школьніка» былі прадстаўлены летась, і з гэтага часу навінка прайшла комплекс неабходных тэхнічных, сертыфікацыйных і прыёмачных выпрабаванняў. Ужо сёлета ў красавіку Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даручыў старшыні праўлення Банка развіцця Сяргею Румасу асвоіць сацыяльны праект «Школьны аўтобус», які прадугледжвае на працягу пяці гадоў поўнае рашэнне праблемы забеспячэння сельскіх населеных пунктаў транспартам для падвозу дзяцей у школу і назад.

Як паведамілі ў прэс-службе МАЗ, для рэалізацыі праекта завод гатовы вырабіць да пачатку гэтага навучальнага года 60 аўтобусаў — па 10 для кожнай вобласці краіны. Зараз МАЗ рыхтуе прэзентацыю навінкі для сталічных журналістаў.

Пятро РАМАНЧУК.

■ Напярэдадні

Часопісу «Право.by» 5 гадоў

2 чэрвеня 2008 года ў друк быў падпісаны першы нумар навукова-практычнага часопіса «Право.by». У 22 нумарах гэтага выдання, якія выйшлі за 5 гадоў, апублікавана больш як 600 навуковых артыкулаў аўтараў не толькі з Рэспублікі Беларусь, але і з Расійскай Федэрацыі, Украіны, Казахстана, Азербайджана, Літвы. За непрацяглы час існавання часопіс «Право.by» стаў добра вядомым выданнем у прафесійнай сферы, з'яўляючыся сродкам зносін прадстаўнікоў юрыдычнай супольнасці, часткай інфармацыйнай прасторы, якая садзейнічае развіццю юрыдычнай навукі.

Сёння ў Беларусі налічваецца каля трох дзясяткаў часопісаў для юрыстаў, адзначае начальнік аддзела навукова-метадычнага забеспячэння прававой інфарматызацыі Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ірына Чупракова. Але толькі 8 з іх маюць статус навуковага выдання для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па юрыдычных навуках. У іх ліку — навукова-практычны часопіс «Право.by», які ўносіць значны ўклад у развіццё навуковай камунікацыі ў краіне і за яе межамі.

Асноўнай мэтавай групай часопіса з'яўляюцца прадстаўнікі юрыдычнай супольнасці, якія займаюцца навуковай дзейнасцю — навукоўцы, прафесарска-выкладчыцкі склад, дактаранты, аспіранты, саіскальнікі навуковай ступені. Вялікі інтарэс выклікаюць артыкулы часопіса ў студэнтаў, чыя будучая прафесійная дзейнасць звязана з юрыспрудэнцыяй, у працэсе іх вучэбнай і навукова-даследчай дзейнасці. Акрамя таго, часопіс, у матэрыялах якога асвятляюцца праблемныя пытанні і актуальныя кірункі развіцця юрыдычнай навукі і практыкі, карысны практычным работнікам, паспяховая дзейнасць якіх залежыць у тым ліку і ад дасведчанасці аб найноўшых дасягненнях галіны, абапіраецца на вынікі навуковых даследаванняў. «Право.by» дае такую магчымасць, аператыўна публікуючы актуальныя і запатрабаваныя матэрыялы па юрыдычнай тэматыцы.

З самага пачатку выхаду часопіс уключаны ў пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па юрыдычных спецыяльнасцях, што прад'яўляе адпаведныя патрабаванні да якасці аўтарскіх матэрыялаў. Галоўным рэдактарам часопіса з'яўляецца дэкан юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар юрыдычных навук, прафесар С.А. Балашэнка. У складзе рэдкалегіі — вядучыя навукоўцы рэспублікі ў галіне права і інфармацыйных тэхналогій.

«Право.by» з'яўляецца пераемнікам зборніка (з 2001 года — навукова-практычнага часопіса) «Проблемы правовой информатизации», які з 1998 года стаў выдавацца НЦПІ з мэтай абмеркавання праблем, звязаных з укараненнем інфармацыйных тэхналогій у прававую сферу. За 10 гадоў існавання часопіс «Проблемы правовой информатизации» стаў своеасаблівым летапісам станаўлення прававой інфарматызацыі ў рэспубліцы, на яго старонках было апублікавана больш як 400 навуковых і навукова-практычных матэрыялаў па адпаведных пытаннях.

Пераўтварэнне ў 2008 годзе часопіса «Проблемы правовой информатизации» ў «Право.by» пацягнула за сабой не толькі значнае пашырэнне тэматыкі, структуры і кантэнту выдання, але і змяненне яго статусу. З вузкаспецыялізаванага часопіса па пытаннях прававой інфарматызацыі выданне ператварылася ў палітэматычны навуковы часопіс, які асвятляе актуальныя тэарэтычныя і практычныя пытанні юрыспрудэнцыі ў цэлым. Рэдакцыя мае намер пашыраць жанравы склад артыкулаў, што публікуюцца ў часопісе, прыцягваючы вядучых спецыялістаў як у галіне юрыспрудэнцыі, так і ў іншых галінах для падрыхтоўкі і апублікавання менавіта такіх матэрыялаў.

Таксама варта адзначыць, што апошнім часам рэдакцыя часопіса актыўна супрацоўнічае з замежнымі аўтарамі, што дазваляе зрабіць больш разнастайнай рубрыку «Замежны вопыт», а таксама пашырыць геаграфічны сегмент распаўсюджвання часопіса. Гэта сведчыць аб павелічэнні колькасці падпісчыкаў ва Украіне і Расійскай Федэрацыі, зацікаўленых у выданні.

Актыўны працэс пераходу ад традыцыйнай сістэмы навуковых камунікацый да электроннай абазначыў перспектывы развіцця часопіса «Право.by» ў анлайнавай прасторы навуковых камунікацый. З 2012 года электронная версія часопіса «Право.by» даступна праз падпіску на сайце НЦПІ за даволі дэмакратычную цану. У бліжэйшай перспектыве — павышэнне інфармацыйнасці старонак часопіса на названым сайце з мэтай большага прыцягнення аўтараў і папулярызацыі выдання як у Рэспубліцы Беларусь, так і за яе межамі.

СТАЛІЧНЫ «КВАДРАТ» НАБІРАЕ ВАГУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ПАВЯЛІЧЫЎСЯ КОШТ І НА ДВУХПАКАЁЎКІ

Відавочна, што максімальны попыт на другасным рынку сталічнага жылля прысутнічае ў сегменце аднапакаёвых кватэр з мінімальнай плошчай. Такія кватэры заўсёды былі самымі таннымі на рынку. Аднак зараз прапанова такога жылля істотна скарацілася, таму выбар сапраўды танных і ліквідных аднапакаёвак мінімальны.

Сёння нават маленькія па плошчы «хрушчоўкі» на крайніх паверхах старых пяціпавярховак прапануюцца не танней чым за 44—46 тысяч долараў. Гэта маламетражкі з агульнай плошчай ад 31 да 34 квадратных метраў. Мінімальны кошт падобнага жылля захаваўся зараз толькі ў Заводскім раёне і Шабанах.

Аналагічнае па плошчы жыллё ў іншых раёнах Мінска каштуе ўжо да 55 тысяч долараў, а ў стандартных панэльных дамах — да 60 тысяч USD. Крыху большыя па плошчы аднапакаёўкі (34—40 кв. м) у спальных раёнах і ў параўнальна нестарых дамах маюць стартавы цэннік ад 60 да 70 тысяч долараў.

На цэннік прыватызацыі ў першую чаргу паўплывае год пабудовы дома і агульная плошча кватэры. Тут ролю адыгрывае і раён прапіскі дома згодна з эканоміка-планіровачнымі зонамі. У сталіцы за прыватызацыю даволі стандартнай кватэры трэба заплаціць часам некалькі дзясяткаў тысяч долараў.

Паводле інфармацыі Мікалая Прасталупава, сярэдні кошт квадратнага метра стандартных аднапакаёвых кватэр панэльных дамоў у спальных раёнах Мінска пры рэальных здзелках складае каля 1500 долараў.

Тут трэба адзначыць і новую тэндэнцыю на рынку: пры адсутнасці дастатковай прапановы аднапакаёвак патэнцыяльныя пакупнікі пачалі больш цікавіцца і двухпакаёвымі кватэрамі невялікіх плошчаў.

Мінімальны кошт прапановы двухпакаёвых кватэр цяпер у сталіцы пачынаецца з 55 тысяч долараў. Гэта зусім слабенькія кватэры з агульнай плошчай да 37—42 квадратных метраў на крайніх паверхах старых дамоў.

Самы распаўсюджаны кошт стандартных двухпакаёвых кватэр з агульнай плошчай ад 43 да 48 квадратных метраў вагаецца ад 60 да 75 тысяч долараў. Хапае на рынку сёння і сапраўды ліквідных двухпакаёвак у спальных раёнах Мінска. Цэннік на такое, ужо больш прасторнае жыллё (50—64 кв. м), складае да 85 тысяч долараў. Цэны на сучасныя двухпакаёўкі ў новых дамах ці бліжэй да цэнтра часам дасягаюць 100 і 150 тысяч долараў. Сярэдні кошт квадратнага метра двухпакаёвых кватэр складае 1400 долараў.

Даволі стабільны попыт прысутнічае зараз на сталічным другасным рынку нерухомасці і на трохпакаёвыя кватэры. Мінімальныя цэннікі на такі тып жылля павялічыліся за апошнія 4 месяцы да 65 тысяч долараў. Гэта кватэры з агульнай плошчай ад 50 да 57 квадратных метраў у старых пяціпавярховых дамах. А вось стандартнае трохпакаёвае жыллё ў панэльных дзевяціпавярхоўках з агульнай плошчай ад 60 да 70 квадратных метраў каштуе ўжо ад 70 да 90 тысяч долараў. Сярэдні цэннік на такое жыллё пры рэальных здзелках складае каля 1300 долараў за квадратны метр.

ПРАДАВЕЦ НА ЗНІЖКІ АМАЛЬ НЕ ІДЗЕ

Павышаны попыт на жыллё сярод патэнцыяльных пакупнікоў змяніў прынцыповы падыход падчас торгу паміж кліентамі. Зараз уласнікі жылля згаджаюцца толькі на мінімальныя зніжкі ў межах 5 працэнтаў ад першапачатковага кошту. Больш за тое, пра зніжку можа ісці гаворка толькі ў тым выпадку, калі паміж першапачатковай цаной прадаўца і рэальным коштам на рынку існуе нейкі зазор, на памер якога і маглічыма ажыццявіць карэкціроўку канчатковай цаны. Тут трэба адзначыць і той факт, што прадаўцы ў маі пачалі наўмысна павялічваць свае цэннікі на кватэры, каб потым была магчымасць выкарыстоўваць сістэму зніжак.

Трэба адзначыць і той факт, што прадаўцы ў маі пачалі наўмысна павялічваць свае цэннікі на кватэры, каб потым была магчымасць выкарыстоўваць сістэму зніжак.

АБ ПРЫВАТЫЗАЦЫІ КВАТЭР

Сёння ў Беларусі налічваецца каля 393 тысяч кватэр, якія ў свой час не былі прыватызаваны. Днямі міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэй Шорац паведаміў, што цяпер практычна распрацаваны, узгоднены і рыхтуецца да накіравання Прэзідэнту праект указа аб пераводзе жылых памяшканняў, выдзеленых грамадзянам па дагаворы найму, у разрад камерцыйнага жылля. У гэтым дакуменце прадугледжваецца перавод у разрад жылля камерцыйнага выкарыстання і службовых жылых памяшканняў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

Нагадаю, што новая рэдакцыя Жыллёвага кодэкса Беларусі прадугледжвае ўвядзенне платы за карыстанне памяшканнямі дзяржаўнага жыллёвага фонду, прадастаўленым па дагаворы найму. Андрэй Шорац удакладніў, што на працягу года з моманту прыняцця гэтага ўказа жыхарам Беларусі даецца права на прыватызацыю такога віду жылля. А вось калі грамадзяне адмаўляюцца або па нейкіх прычынах не могуць яго прыватызаваць, то гэтае жыллё пераводзіцца ў ранг арэнднага. Больш за тое, калі людзі не гатовы ні прыватызаваць, ні плаціць за карыстанне такімі кватэрамі, то такое жыллё па заяве жыхара трапляе ў структуру жылля сацыяльнага карыстання без яго магчымай прыватызацыі.

Зразумела, што такая навіна не застанецца па-за ўвагай карыстальнікаў падобных кватэр, лічыць Мікалай Прасталупаў. Так, у першыя месяцы пасля прыняцця ўказа жыхары такога жылля пачнуць больш актыўна варушыцца, каб змяніць свой статус. Разам з тым нейкага ажыятажу такая актывізацыя не справакуе.

Справа ў тым, што вельмі малая колькасць карыстальнікаў падобнага жылля ў свой час сапраўды паленавалася яго прыватызаваць ці мела фінансавыя цяжкасці, каб ажыццявіць дзел мясцовай адміністрацыі з адпаведнай заявай. Там кліенту ўжо ў дзень звароту спецыялісты паведамяць канкрэтны кошт прыватызацыі такой кватэры.

Мікалай Прасталупаў адзначае, што на цэннік прыватызацыі ў першую чаргу паўплывае год пабудовы дома і агульная плошча кватэры. Прыватызацыя кватэры ў сапраўды старых дамах значна таннейшая, чым у больш новых. Тут ролю адыгрывае і раён прапіскі дома згодна з эканоміка-планіровачнымі зонамі. У сталіцы за прыватызацыю даволі стандартнай кватэры трэба заплаціць часам некалькі дзясяткаў тысяч долараў. У рэгіёнах прыватызацыя кватэр будзе каштаваць карыстальніку значна танней.

Сярэдні кошт квадратнага метра стандартных аднапакаёвых кватэр панэльных дамоў у спальных раёнах Мінска пры рэальных здзелках складае каля 1500 долараў.

Звычайна працэдуру прыватызацыі кватэры кліентам дапамагаюць ажыццявіць агенцтвы нерухомасці. Згодна з пэўным алгарытмам ідзе падрыхтоўка ўсіх неабходных дакументаў, а канчатковая прыватызацыя займае не больш як месяц пасля аплаты. Каштуе такая паслуга ва ўсіх агенцтвах нерухомасці аднолькава, згодна з дзейнымі тарыфамі, якія зацверджаны Саўмінам.

ПРАГНОЗНАЕ ПАДАРАЖАННЕ ЖЫЛЛЯ — 1,5% ЗА МЕСЯЦ

Наш эксперт Мікалай Прасталупаў упэўнены, што сёлета да першых дзён ліпеня на другасным рынку жыллёвай нерухомасці сталіцы будзе назірацца ўпэўненае падаражанне кватэр з тэмпам не менш як 1,5% за месяц.

Чаму «часам пік» лічыцца менавіта ліпень? У гэтым месяцы спецыялісты рынку нерухомасці чакаюць выхаду некалькіх дакументаў па жыллёвай тэматыцы. Магчыма тады пачне дзейнічаць праект закона аб ільготным крэдытаванні. Ёсць верагоднасць, што камерцыйныя забудоўшчыкі пачнуць атрымліваць пляцоўкі пад новыя жыллёвыя аб'екты толькі па конкурсе, дзе арганізатарам інвестыцыйнага працэсу могуць прапанаваць будаўніцтва сацінфраструктуры за ўласныя сродкі. А гэта павінна адбіцца і на павелічэнні кошту будаўніцтва квадратнага метра ў долевым сектары.

Ужо сёння на першасным рынку жылля сталіцы тыпавыя варыянты будаўніцтва каркасных дамоў прапануюць кліентам кватэры, дзе квадратны метр будучага жылля дасягае 1300—1500 долараў. Самыя танныя кватэры па лініі долевага будаўніцтва прапануюцца кліентам на стадыі «катлавана», калі дом будзе пабудаваны не раней, чым праз 2—3 гады. У гэтым выпадку квадратны метр жылля без апрацоўкі прапануецца людзям па кошце ад 1100 да 1200 долараў. Больш за тое, цяпер каля паловы прапановы новага камерцыйнага жылля ў Мінску мае цэннік 1700—1800 долараў за квадратны метр.

Зараз у нашай краіне назіраецца такая сітуацыя, калі сабекошт будаўніцтва ў айчыннай валюце павялічваецца, а кошт замежнай валюты застаецца нязменным. У выніку кошт камерцыйнага будаўніцтва павялічваецца і ў долярах.

У сувязі з пералічанымі тэндэнцыямі наш эксперт прапануе доўгатэрміновы прагноз змянення цэннікаў на сталічнае жыллё. На думку Мікалая Прасталупава, калі жыллё ў сталіцы па лініі камерцыйнага будаўніцтва будзе здавацца, як і зараз, па мінімуме, то ўжо праз год сярэдні кошт квадратнага метра стандартнага жылля на другасным рынку Мінска павялічыцца да 2 тысяч долараў.

Сяргей КУРКАЧ.

ОАО «Элегант» ИНФОРМИРУЕТ
об изменении повестки дня внеочередного общего собрания акционеров общества 29.05.2013 г.
ПОВЕСТКА ДНЯ:
1. Об утверждении уточненного бухгалтерского баланса общества.
Наблюдательный совет.
УНП 400078331

■ Пачын

ПРАБЛЕМЫ ЛЯЧЭННЯ РАКУ АБМЕРКАВАЛІ... ПАДЧАС ТЭЛЕМОСТА

«Прафілактычныя мерапрыемствы па раннім выяўленні злаякасных новаўтварэнняў даказалі сваю эфектыўнасць, — заявіў падчас першай беларуска-літоўскай навукова-практычнай тэлевідэаканферэнцыі «Дасягненні і праблемы сучаснай медыцыны» намеснік міністра аховы здароўя Ігар ЛАСІЦКІ.

Пры росце захваральнасці ад гэтага класа захворванняў у Беларусі практычна стабілізавалася смяротнасць ад раку. У 2012 годзе пры прафілактычных аглядах пацыентаў было выяўлена 24,7 тысячы выпадкаў анкалагічных захворванняў, што складае 60,2% ад усіх упершыню выяўленых выпадкаў раку. Колькасць анкалагічных захворванняў, выяўленых на ранніх стадыях, склала 25,4 тысячы выпадкаў, або 62,5% ад упершыню выяўленых. Ігар Ласіцкі адзначыў таксама станоўчую дынаміку пяцігадовай выжывальнасці і павелічэння працягласці жыцця пацыентаў з анкалагічнай паталогіяй: з 250 тысяч пацыентаў, якія знаходзяцца на дыспансерным уліку, 148 тысяч чалавек перасягнулі пяцігадовую мяжу.

З мэтай ранняй дыягностыкі анкалагічных захворванняў у Беларусі быў распачаты скрынінг раку прастаты. У Мінску — мамаграфічны скрынінг. На чарзе — арганізацыя скрынінгу раку шыйкі маткі і каларэктальнага раку.

— Арганізацыя тэлевідэаканферэнцыі дала нам унікальную магчымасць сабраць адначасова такую вялікую колькасць спецыялістаў з дзвюх краін: як урачоў-практыкаў, так і прафесарска-выкладчыцкі састаў, — расказаў **старшыня Беларускай асацыяцыі ўрачоў, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і моладзевай палітыцы Дзмітрый ШАЎЦОЎ.** — У Беларусі студыі былі арганізаваны ў Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі і ва ўсіх абласных медуніверсітэтах, дзе таксама працуюць кафедры анкалогіі. А ў Літве дзейнічалі студыі ў Вільнюсе, Каўнасе і Шаўляі.

Ідэя арганізаваць тэлемост для абмену практычным досведам узнікла яшчэ падчас леташняга візіту нашых калег з асацыяцыі ўрачоў Літвы. І Міністэрства аховы здароўя яе падтрымала. Тэма відэаканферэнцыі была абрана зусім не выпадкова: анкалагічныя захворванні з'яўляюцца сур'ёзнай сацыяльна-эканамічнай і медыцынскай праблемай для ўсіх развітых краін свету. Для прыкладу, у Беларусі смяротнасць ад анкалагічных захворванняў займае другое месца пасля сардэчна-сасудзістых захворванняў.

Дзякуючы пастаяннай увазе з боку дзяржавы анкалогія пераўтварылася ў Беларусі ў адну з самых дынамічных галін у сістэме аховы здароўя.

— У Беларусі ёсць сур'ёзныя напрацоўкі ў лячэнні анкалогіі як дарослага насельніцтва, так і дзяцей. Яны ўяўляюць цікавасць для замежных калег, якія актыўна вывучаюць і пераймаюць наш досвед, — дадаў Дзмітрый Шаўцоў.

У цэнтры ўвагі ўдзельнікаў тэлевідэаканферэнцыі аказаліся такія пытанні, як дыягностыка і прафілактыка меланомы, фактары рызыкі і сучасныя падыходы для лячэння раку малочнай залозы, пашкоджанні печані пасля хіміятэрапіі, сучасная прамянёвая дыягностыка ў анкалогіі, нізкаінтэнсіўнае лазернае выпраменьванне ў комплексным лячэнні раку малочнай залозы, першасныя множныя злаякасныя ўтварэнні, рэалізацыя пілотнага праекта па скрынінгу раку шыйкі маткі і многія іншыя.

Дзмітрый Шаўцоў выказаў упэўненасць, што практыка правядзення тэлемастоў паміж беларускімі і літоўскімі медыкамі будзе падоўжана. У бліжэйшых планах значыцца абмен досведам у такіх галінах, як кардыялогія, гастраэнтэралогія і пульманалогія.

Між іншым, падчас станаўлення беларускай транспланталогіі беларускія спецыялісты вучыліся майстэрству ў тым ліку і ў сваіх літоўскіх калег. У 2009 годзе быў заключаны дагавор паміж рэспубліканскім навукова-практычным цэнтрам «Кардыялогія» і Сантарышскімі клінікамі бальніцы Вільнюскага ўніверсітэта па пытаннях узаемадзеяння ў вобласці перасадкі сэрца. Ёсць дагаворы аб супрацоўніцтве ў вобласці анкалогіі, касметалогіі. Адным словам, як трапна заўважыў Ігар Ласіцкі, «мы не проста суседзі».

Надзея НІКАЛАЕВА

■

Даты | Падзеі | Людзі

1520 год — нарадзіўся Мацей Кавячынскі, беларускі кнігавыдавец, перакладчык, дзеяч Рэфармацыі. У 1540-х гадах вучыўся ў Вітэнбергскім універсітэце. З канца 1550-х жыў у Беларусі. Нясвіжскі намеснік Мікалая Радзівіла Чорнага. Заснаваў порт на рацэ Узда, папяровую фабрыку ў Нясвіжы. Удзельнічаў у рэфармацыйным руху ў Літве, Польшчы і Беларусі, займаўся распаўсюджваннем выданняў сярод беларускага і ўкраінскага насельніцтва. У 1561-1562 гадах сумесна з С. Будным і Л. Крышкоўскім заснаваў Нясвіжскую друкарню, дзе ўбачыла свет больш за 10 кніг, у тым ліку першыя пратэстанцкія выданні на беларускай мове «Катэхізіс» і «Аб апраўданні грэшнага чалавека перад Богам», пераклады «Святога Пісання». Аўтар прадмоў да некаторых нясвіжскіх выданняў. Памёр у 1572 годзе.

1937 — пачала сваю работу першая навукова-даследчая палярная станцыя «Паўночны полюс-1» пад кіраўніцтвам Івана Папаніна. 21 мая ў 11 гадзін 35 хвілін флагманскі самалёт Міхаіла Вадап'янава апусціўся на лёд, пераляцеўшы 20 кіламетраў за Паўночны полюс. «Сапраўднага чалавека цягне туды, дзе цяжка», — казаў адзін з кіраўнікоў экспедыцыі акадэмік Ота Юльевіч Шміт. З гераічнага дрэйфу папанінцаў пачалося планамернае асваенне ўсяго Арктычнага басейна і рэгулярны рух па Паўночным марскім шляху.

1940 год — нарадзіўся (горад Мінск) Анатоль Мікалаевіч Сарокін, беларускі гісторык, доктар гістарычных навук (1980), прафесар (2004), член-карэспандэнт НАН Беларусі (2009). Асноўныя навуковыя публікацыі прысвечаны праблемам агульнай і эканамічнай гісторыі, прававога рэгулявання грамадскіх адносін, аграрнай гісторыі Беларусі XX ст., гістарыяграфіі і метадалогіі гістарычнай навукі. Адзін з аўтараў калектыўных работ «Гісторыя Беларускай ССР», «Развіццё эканомікі Беларусі ў 1928-1941 гг.» і іншых.

Было сказана

Антон БЯЛЕВІЧ (1914-1978), паэт:

«Кажуць: дома вуглы памагаюць.
Дома жыць і рабіць весялей...
Чалавек без бацькоўскага краю —
Як без песні ў гаі салавей».

■ Конкурс

ПАСПЕЦЬ ЗАВЕСЦІ ЗА 15 ХВІЛІН

23-24 мая ў Мінску пройдзе рэспубліканскі конкурс «Лепшы работнік аўтасэрвісу» (намінацыя «Дыягностыка электронных сістэм упраўлення аўтамабіля») сярод работнікаў суб'ектаў прадпрымальніцкай дзейнасці, што аказваюць паслугі па тэхнічным абслугоўванні і рамонце транспартных сродкаў.

Зараз у краіне зарэгістравана 3 196 532 аўтамабілі. Дапамогу аўтаўладальнікам па тэхнічным абслугоўванні і рамонце гэтых транспартных сродкаў аказваюць 3 827 індывідуальных прадпрымальнікаў і 3 189 юрыдычных асоб.

Як сцвярджае арганізатар, Міністэрства гандлю, правядзенне конкурсу — значнае мерапрыемства, паколькі спаборніцтвы такога ўзроўню даюць спецыялістам выдатную магчымасць уступіць у добрую канкурэнцыю адзін з адным, праявіць крэатыў і творчае мысленне, дазваляюць палепшыць якасць паслуг. Спрыяюць яны і фарміраванню пазітыўнай грамадскай думкі ў дачыненні да ўказанай прафесіі, а таксама прыцягненню моладзі да рынку працы ў галіне абслугоўвання і рамонту транспартных сродкаў.

Арганізацыі аўтасэрвісу могуць выстаўляць для ўдзелу ў конкурсе некалькіх работнікаў. Конкурс пройдзе ў тры этапы цягам двух дзён. Удзельнікі атрымаюць тэарэтычныя тэставыя заданні на веданне тэхнічнага стану аўтамабіля і практычнае заданне — выявіць і выправіць няспраўнасці электроннай сістэмы аўтамабіля. Пераможцы адборачных этапаў выступяць у фінале конкурсу, які пройдзе 24 мая на пляцоўцы шматпрофільнага культурна-спартыўнага комплексу «Мінск-Арэна» ў рамках міжнароднага аўтасалона «Мотаршоу». У фінале ўдзельнікі атрымаюць практычнае заданне — выявіць і выправіць няспраўнасці электроннай сістэмы аўтамабіля і завесці яго за 15 хвілін.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

ТЭРЫТОРЫЯ «СУХОГА ЗАКОНА»

Адлік гісторыі лячэбна-працоўных прафілакторыяў ідзе з 1964 года. Менавіта тады ў тагачаснай Казахскай ССР з'явілася першая ўстанова, куды суд накіроўваў на прымусовае лячэнне ад алкагалізму. Прафілакторыі паступова былі створаны і ва ўсіх астатніх рэспубліках Савецкага Саюза. Да нашых дзён гэтыя ўстановы захаваліся толькі ў Беларусі, Туркменістане і Прыднястроўі. Каб паглядзець, што гэта такое, карэспандэнт «Звязды» накіраваўся ў лячэбна-працоўны прафілакторый № 6, які знаходзіцца ў Дзяржынску.

ПРАФІЛАКТОРЫЙ ПАЧЫНАЕЦЦА З САНЧАСЦІ

Лячэбна-працоўны прафілакторый №6 самы «малады» ў Беларусі. У жніўні яму споўніцца толькі чатыры гады.

Першыя крокі па тэрыторыі — і ў поле зроку трапляе будоўля.

— Хутка тут размесціцца паўнавартасная медыцынская часць. Справа ў тым, што пакуль у нас тут можна атрымаць толькі тэрапеўтычную і антыалкагольную тэрапію, здаць аналізы. Пры іншым раскладзе даводзіцца везці людзей у цэнтральную раённую бальніцу, — кажа начальнік лячэбна-працоўнага прафілакторыя № 6 Уладзімір Гарыст. — Гэта нязручна для ўсіх. Лячэнне залежнасці ад алкаголю ў прафілакторыі дабравольнае. Не хоча чалавек кадзіравацца — яго права. Хаця тут гэта зробяць бясплатна, а ў грамадзянскай клініцы давядзецца выкласці кругленькую суму. Вымушаная гадавая адмова ад «зялёнага змія» ідзе на карысць: за гэты час арганізм паступова ачышчаецца ад атруты. Ад абстынентнага сіндрому дапамагаюць пазбавіцца і гутаркі з урачом-псіхолагам.

Кліенты прафілакторыя тройчы праходзяць флюараграфію — пры засяленні, праз паўгода і напярэдадні выхаду. Такі пільны кантроль звязаны з тым, што сюды часта трапляюць людзі, якія вялі асацыяльны лад жыцця. Сем з дзесяці накіраваных у прафілакторый маюць за плячыма як мінімум адну судзімасць.

АД КОЖНАГА ПА ЗДОЛЬНАСЦЯХ, КОЖНАМУ ПА ПРАЦЫ...

Асаблівы ўпор тут робіцца на працатэрапію. Многія з тых, хто ўпершыню праходзіць праз КПП, ужо і не памятаюць, калі ў апошні час пераступілі парог прахадной вытворчага прадпрыемства. Падчас асабістай гутаркі начальнік атрада высвятляе, кім чалавек хоць калісьці працаваў, стараецца падысці да кожнага індывідуальна.

Распарадак дня ў прафілакторыі строгі. Каманда «Пад'ём!» гучыць штодня ў шэсць гадзін раніцы. На тое, каб прачнуцца, апрануцца і выстраіцца для пераклічкі, адведзена 15 хвілін. Пасля гэтага наступае час для ранішняга туалету і снедання. У восем трыццаць — развод на работу: прыходзяць майстры і пачынаюць камплектаваць брыгады. Адны застаюцца ў цэхах на тэрыторыі прафілакторыя, другія адпраўляюцца працаваць на гарадскія прадпрыемствы. Усё залежыць ад кваліфікацыі работніка.

Працоўны дзень для насельнікаў ЛПП доўжыцца не больш за сем гадзін і звычайна заканчваецца ў 16.45. Справа ў тым, што чалавек павінен мець штодня як мінімум тры гадзіны вольнага часу. Пры васьмігадзінным працоўным дні графік вытрымліваць няма магчымасці. І таму людзі выходзяць на працу і ў суботу, але не больш чым на пяць гадзін. Прафільнага навучання тут няма. Дамінуе прынцып «рабі як я». Выхадны ў іх толькі раз на тыдзень, у нядзелю.

З варот лячэбна-працоўнага прафілакторыя штомесяц вывозяць прадукцыі на суму каля трох мільярдаў рублёў. Тут робяць корпусную мэблю, абшыўку кабін беларускіх трактароў, шыюць сядзенні, выпускаюць шпакоўні, альтанкі, піламатэрыялы, вараць металаканструкцыі... Словам, ЛПП нечым нагадвае такую ўніверсальную фабрыку.

— Як і на звычайным прадпрыемстве, разлік з рабочымі праходзіць двойчы на месяц. З налічанай сумы знімаецца пэўны працэнт платы за ўтрыманне, — яна зараз складае 891 тысячу рублёў. Пры неабходнасці спаганяюцца штрафы, аліменты, іскі, якія назапашваліся гадамі. Некаторыя людзі тут упершыню расплачваюцца па такіх даўгах. Рэшту бухгалтэрыя пералічвае на асабісты рахунак. Што з ім рабіць далей, вырашае сам чалавек. Адны лічаць за лепшае збіраць грошы і пры вызваленні ад'язджаюць з сумай у некалькі мільёнаў рублёў, — распавядае намеснік начальніка па папраўчым працэсе, ідэалагічнай рабоце і кадравым забеспячэнні Франц Кандратовіч. — Другія штотыдзень ходзяць у краму, асартымент якой нічым не адрозніваецца ад звычайных прадуктовых магазінаў. Там можна набыць прадукты, якіх няма ў паўсядзённым меню сталовай, — напрыклад, каву ці цыгарэты. Наяўныя грошы ў прафілакторыі пад забаронай. Іх можна атрымаць толькі ў дзень выхаду.

На асаблівым уліку ў нас знаходзяцца так званыя абавязаныя асобы. Гэта людзі, якія павінны кампенсаваць выдаткі па выхаванні сваіх дзяцей. Іх у нас прыкладна дзясятая частка. Са свайго боку, мы таксама ідзём ім насустрач — імкнёмся пераводзіць на тыя працоўныя ўчасткі, дзе зарплата вышэйшая.

На абед у мясцовай сталовай сёння — макарона па-флоцку, малочны суп і кісель.

ПАСЛЯ ПРАЦЫ — ЗАНЯТКІ ПА ІНТАРЭСАХ

Пасля вяртання з працы начальнік атрада здае ўсю неабходную дакументацыю, а кантынгент рыхтуецца вячэраць. І потым пачынаецца асабісты час. Адны хочуць глядзець тэлевізар. Другія больш любяць праводзіць вячэрнія гадзіны з кніжкай у руках. Да трэціх прыехалі на кароткатэрміновае спатканне сваякі ці знаёмыя. У 20.30 людзей правярае на пераклічцы дзяжурная змена. І праз паўтары гадзіны — адбой...

— Наведваць нашых кліентаў можна хоць кожны дзень. Ніякіх абмежаванняў накшталт тых, што існуюць у папраўчай калоніі, у нас няма, — разважае Франц Кандратовіч. — Часам прыязджаюць людзі, якія ўжо лячыліся ў прафілакторыі, — да сяброў. Больш за тое, ужо сёлета на Дзяржыншчыне знайшлі прытулак чатыры чалавекі, якія правялі ў нас год. Ісці ім не было куды, а вяртацца ў ранейшы «п'яны асяродак» не пажадалі. Уладкаваліся ў СВК, на прадпрыемствы. А некалькі гадоў таму ў прафілакторыі нават адгулялі вяселле.

Рэгулярна прафілакторый наведваюць праваслаўныя і каталіцкія святары, заязджаюць туды і прадстаўнікі пратэстанцкіх канфесій.

Дапамагае і Дзяржынскі райвыканкам. Ён арганізаваў выязную гарадскую бібліятэку. Кожны аўторак любы можа атрымаць упадабаную кнігу. Нарасхват ідзе літаратура любых жанраў — ад гістарычных даследаванняў да бульварных дэтэктываў. Завітваюць сюды з канцэртамі і раённыя самадзейныя калектывы. Перыядычна райвыканкам арганізоўвае экскурсіі па памятных месцах Дзяржыншчыны — у Станькава, краязнаўчы музей, Скірмунтава, на знакамітую Лысую гару. Ёсць на рахунку ЛПП № 6 і спартыўныя дасягненні. Каманды па настольным тэнісе і валейболе летась выйгралі спаборніцтвы паміж прафілакторыямі.

АЛКАГАЛІЗМ НЕ ВЫБІРАЕ

Каб патрапіць у прафілакторый, трэба за год займець чатыры канфлікты з законам на глебе п'янства. Прычым пасля трох дробных парушэнняў начальнік раённага аддзела ўнутраных спраў выклікае да сябе выпівоху, і аматар спіртнога ставіць асабісты подпіс пад афіцыйным папярэджаннем. Яшчэ адзін «залёт» — і медыцынская камісія будзе вызначаць ступень прыдатнасці чалавека да накіравання ў лячэбна-працоўны прафілакторый. Далей справа пойдзе ў суд.

У прафілакторыі накіраваны праводзіць адзін год. Сюды трапляюць толькі паўналетнія. Калі чалавек адзначае свой шасцідзясяты дзень нараджэння на тэрыторыі ЛПП, ён атрымлівае своеасаблівы падарунак у выглядзе вызвалення.

У вытворчых карпусах.

Крывая дарожка можа завесці ў прафілакторый чалавека любой прафесіі — як трактарыста, так і ювеліра, ці мастака, альбо журналіста. Ёсць тут і своеасаблівы «рэкардсмен», які трапляе сюды ўжо ў шосты раз...

Перада мной сядзіць ціхенькі непрыкметны мужчына, якому крыху больш за трыццаць. Завуць яго Сямён. Ён працуе старшым днявальным прафілакторыя.

— Нават дагэтуль не разумею, як уцягнуўся ў гарэлку. У нейкай ступені кампанія «паспрыяла», ды і сам вінаваты. Спачатку ад гарэлкі адварочвала, пасля чарка кулялася нармальна. А як нап'юся — і цягне «на подзвігі». Раз восем-дзевяць на мяне складалі пратаколы за дробнае хуліганства. Тут я ўжо адзінаццаць месяцаў, засталося зусім нічога. Вярнуся дадому, у калгас. Чакаюць мяне трохгадовая дачка і жонка — як яна там па гаспадарцы ўвіхаецца без мяне... Не, больш я сюды ні нагой, дастаткова з мяне і аднаго разу.

Трыццацігадовы Віктар П. патрапіў у прафілакторый з Мінска. Быў індывідуальным прадпрымальнікам, але усё перавярнула любоў да спіртнога. Пастаянныя п'яныя скандалы з бацькамі скончыліся гадавой «пуцёўкай» у Дзяржынск. Тры месяцы ён працуе на сталярным участку падсобным рабочым.

ЛЕПШ ЛПП, ЧЫМ ТУРМА

Магчымасці пакінуць тэрыторыю беларускіх прафілакторыяў умоўна-датэрмінова сёння няма. За грубыя парушэнні распарадку тэрмін утрымання могуць і падоўжыць, але не больш чым на паўгода. Аснову такіх парушэнняў складаюць класічныя «самаволкі» і з'яўленне ў п'яным выглядзе.

Уладзімір Гарыст лічыць, што неабходнасць прафілакторыяў па-ранейшаму актуальная:

— Тут трэба глядзець грунтоўна. Дапусцім, чалавек па п'янцы трапіў у турму і атрымаў па прыгаворы суда нейкі пэўны тэрмін. Выходзіць на волю, і далёка не кожная арганізацыя потым возьме на працу чалавека з судзімасцю, няхай нават і дворнікам ці чорнарабочым. А есці і апранацца трэба. Калі праца так і не знаходзіцца, далей падзеі развіваюцца пераважна па двух шляхах. Альбо небарака збірае бутэлькі і макулатуру, альбо зноў пачынае парушаць закон. Кола замкнулася...

А вось прафілакторый якраз у нейкай ступені дапамагае чалавеку знайсці сваё месца ў грамадстве. Летась адсюль вызваліўся Л. Мужчына ў самым росквіце сіл збіраў па сталіцы паперу, шклатару ажно восем гадоў, нідзе не працуючы. Калі да нас паступіў, то выглядаў на ўсе семдзесят. Хаця споўніўся яму толькі сорак тры... Пры асабістай гутарцы я высветліў, што Л. увогуле не меў ніякай кваліфікацыі. А ў нас ён стаў лепшым апальшчыкам у лазні, там заўсёды панаваў ідэальны парадак. Безумоўна, прафілакторый дапамагае не ўсім. Але, па нашай статыстыцы, пасля вызвалення каля трыццаці-сарака працэнтаў людзей «завязваюць» з алкаголем. Хаця б на некаторы час.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Фота аўтара.

Дзяржынск.

P.S. ***Усё імёны ў тэксце зменены з этычных меркаванняў.***

Вось такія прыгожыя рэчы робяць у ЛПП №6.

ЯНУШКОВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
